Дзяржаўная ўстанова культуры
«Сетка публічных бібліятэк Мсціслаўскага раёна»



# Каляндар
# ЗНАМЯНАЛЬНЫХ І ПАМЯТНЫХ ДАТ на 2024 год

## *Мсціслаўскі раён*



Мсціслаў, 2023

Каляндар знамянальных і памятных дат па Мсціслаўскаму раёну на 2024 год / Мсціслаўская цэнтральная бібліятэка ;[складальнік С. В. Хмурович; адказны за выпуск Н. В. Сідарэнкава]. — Мсціслаў : Мсціслаўская цэнтральная бібліятэка, 2023.

«Краязнаўчы каляндар» – бібліяграфічнае выданне, якое дапаможа чытачам лепш пазнаць свой край, а бібліятэкарам – прапагандаваць краязнаўчую літаратуру.

Уключаныя ў каляндар знамянальныя і памятныя даты адлюстроўваюць важныя падзеі гісторыі, грамадскага, гаспадарчага і культурнага жыцця нашага раёна, дзейнасць выдатных людзей, звязаных з нашым краем.

Да кожнай даты даецца кароткая даведка, указваецца літаратура. У якой часам сустракаюцца і ілюстрацыі.

Матэрыялы каляндара можна выкарыстоўваць пры рэкамендацыі літаратуры чытачам, арганізацыі выстаў літаратуры, для падрыхтоўкі гутарак, аглядаў літаратуры, тэматычных вечароў, папаўнення краязнаўчых картатэк.

Дзяржаўная ўстанова культуры “Сетка публічных бібліятэк Мсціслаўскага раёна”, 2023

**Студзень**

**90 год з дня нараджэння кавалера ордэна Славы, Мінчанкава Міхея Мітрафанавіча**



Нарадзіўся 15.01.1934 г. у вёскі Каськова Мсціслаўскага раёна. Поўны кавалер ордэна Славы. На фронце з 1943 г. камандзір стралковага аддзялення сяржант Мінчанкаў вызначыўся ў баях на тэрыторыі Літвы і Ўсходняй Пруссіі. 7 – 15.08.1944 г., адбіваючы контратакі ворага, знішчыў 15 гітлiраўцаў, 17.08 – 25.10.1944 г. у абаронча-наступальных баях – 19 гітлiраўцаў. 17.04.1945 г. пры адбіцці контратакі зайшоў у фланг ворага і агнём прымусіў яго адступіць, знішчыў 6 і ўзяў у палон 11 гітлiраўцаў. За час вайны знішчыў 125 варожых салдат і афіцэраў.Пасля вайны працаваў у калгасе да пенсіі. Пражываў у Мсціславе.

Памёр 15 кастрычніка 2003 г.

**Літаратура:**


Мінчанкаў Міхей Мітрафанавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : Энцыклапедыя/ Беларуская Савецкая Энцыклапедыя.— Мінск, 1990.—С. 365.

Минченков Михей Митрофанович // Навечно в сердце народном: Справочник.—3-е изд.—Минск,1984.—С. 353.

Мінчанкаў Міхей Мітрафанавіч// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—2003.—15 кастрычніка.

Анціўевіч, А. І ў баі, і ў працы/ А. Анціўевіч //Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1986.—3 ліпеня.

Анюкоў, М. Салдацкае шчасце/ М. Анюкоў //Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1978.—1 ліпеня.

Афанасьеў, І. Ішоў салдат/ І. Афанасьеў //Магілёўская праўда.—1978.—21 лютага.

Беляеў, І. Як патрабавала Айчына/ І. Беляеў //Магілёўскаяпраўда.—1983.—12 красавіка.

И в бою, и в труде //Сел.хоз-во Белоруссии.—1986.— № 1.—С. 33.

Крымаў, І. Кавалер трох ордэнаў Славы/ І. Крымаў //Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1974.—9 мая.

Лук’янчык, В. Дзеля жыцця на зямлі: нарыс/ В. Лук’янчык//Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1969.—22 ліпеня.

Макаловіч, В. Мужнасць/ В. Макаловіч //Зара камунізма (Бялынічы).—1976.—7 лютага; Ленінскае слова (Слаўгарад).—1976.—23 сакавіка.

Манышаў, М. Салдацкі подзвіг/ М. Манышаў //Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1984.—23 лютага.

Снайпер Минченков //Зорька.—1980.—15 февраля.

## Люты

### 125 год з дня нараджэння генерала маёра, Валковіча Цімафея Іванавіча



Нарадзіўся 21 лютага 1899 г. у в. Жукава Мсціслаўскага павета ў сям'і вясковага дзячка, генерал-маёр(1945), ганаровы грамадзянін г. Пласы Чэхаславацкай Рэспублікі, удзельнік грамадзянскай і Вялікай айчыннай войнаў.

Скончыў Мсціслаўскае духоўнае вучылішча (1914), вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі да кастрычніка 1917 г., затым скончыў 1-ую Маскоўскую кавалерыйскую школу (1923), курсы ўдасканалення каманднага саставу (КУКС) (1926). Ваенную акадэмію Генштаба (1947).

Працоўную дзейнасць пачаў у 1918 г. пісарам Магілёўскага губернскага суда, справаводам Піранскага валаснога ваенкамата. У Чырвонай Арміі з мая 1919 г. – добраахвотнікам.

Удзельнік баёў на Заходнім фронце супраць белапалякаў у складзе другога Гомельскага пралетарскага батальёна, у кастрычніку пад Заслаўлем быў паранены.

З 1923 г. праходзіў службу ў 2-ім кавалерыйскім палку 1-ай каўказскай дывізіі “Чырвонага казацтва” – памошнік камандзіра ўзвода, загадчык разведкі палка, памошнік начальніка штаба. У маі 1928 г. – начальнік пагранразведкі на польскай граніцы, з 1933 г. – начальнік вайсковай разведкі Дальнеўсходняга ўмацаванага раёна Дэ-Кастры, з 1937 г. – старшы памошнік начальніка 9-га аддзела штаба Далёкаўсходняй акругі. З 1938 г. – начальнік штаба 17-ай кавалерыйскай дывізіі ў Закаўказзі. З сакавіка 1940 г. прызначаны для асобных даручэнняў пры камандуючым Закаўказскай ваеннай акругай.

Са снежня 1940 г. – палкоўнік, камандзір 47-ай горна-стралковай дывізіі Закаўказскай ваеннай акругі. Са жніўня 1941 па люты 1942 г. – камандзір 402-ой стралковай дывізіі. Са жніўня 1942 г. – камандзір 75-ай стралковай дывізіі, што знаходзілася ў Іране. Са снежня 1943 па май 1945 г. – камандзір 117-ай гвардзейскай стралковай Бярдзічаўскай дывізіі 1-га Украінскага фронту.

З сакавіка 1946 па май 1947 г. – слухач Ваеннай акадэміі імя М.В. Фрунзе, з 1948 па 1956 г. – начальнік Шуйскага ваеннага вучылішча (пераведзенага потым у г. Баранавічы Наўгародскай вобл.).

З 1956 г. у адстаўцы па хваробе. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна (21.02.1945 і 06.04.1945), чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Кутузава, Чырвонай Зоркі, чэхаславацкім ордэнам “Крыж 39 года”, сямю медалямі. Жыў у г. Баранавічы Наўгародскай вобласці.

Памёр 1 ліпеня 1981 г.

**Літаратура:**

Гасянкоў, У.Л. Валковіч Цімафей Іванавіч: Генералы з Мсціслаўшчыны/ У.Л. Гасянкоў// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гістарычна-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 259 — 260.

## Сакавік

### 150 год з дня нараджэння вучонага ў галіне бактэрыялогіі і паталагічнай анатоміі бактэрыяльных інфекцый, клініцыста, арганізатара аховы здароўя, доктара медыцынскіх навук, прафесара, Заслужанага дзеяча навукі РСФСР , Марцiноўскага Яўгена Іванавіча



Нарадзіўся 7 сакавіка 1874 г. у Мсціславе Магілёўскай губерні. Вучоны ў галіне бактэрыялогіі і паталагічнай анатоміі бактэрыяльных інфекцый, клініцыст, арганізатар аховы здароўя, доктар медыцынскіх навук (1909), прафесар (1923). Заслужаны дзеяч навукі РСФСР (1934).

Гады вучобы прайшлі ў цяжкіх матэрыяльных ўмовах. Дзед ўладкаваў яго ў прагімназію ў Рослаўі, затым гімназію ў Смаленску. Паступіў на медыцынскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. Пасля заканчэння ўніверсітэта працаваў урачом-бактэрыёлагам Паўлаўскай бальніцы (зараз Маскоўская клінічная бальніца), лабарантам у патолага–анатамічным інстытуце Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1902 г. – ардынатар заразных баракаў Паўлаўскай бальніцы, а затым старшы ўрач.

Працаваў у Вятцы над вывучэннем сібірскай язвы (1904), быў у навуковых паездках па Закаўказзі, дзе вывучаў “усходнюю язву” і малярыю (1904–1905). У 1908–1909 гг. працаваў асістэнтам на кафедры бактэрыялогіі медыцынскага факультэта вышэйшых жаночых курсаў. У 1910 г. атрымаў званне прыват-дацэнта Маскоўскага ўніверсітэта па курсу «Патогенные протозои и их роль в патологии человека и животных». У 1911 г. з групай прафесараў і дацэнтаў у знак пратэста супраць міністра адукацыі Касо падаў у адстаўку.

У складзе экспедыцыі, якую ўзначальваў І. І. Мечнікаў, выязджаў у кіргізскі стэп для вывучэння ачагоў чумы, выбіраўся старшынёй камісіі па вывучэнні малярыі ў Расіі пры таварыстве рускіх урачоў у памяць М. І. Пірагова. Ездзіў у Італію для азнакамлення з супрацьмалярыйнымі работамі, атрымаў ганаровы дыплом на выставе па малярыі і пратазойным хваробам у Дрэздэне.

У 1911–1913 гг. працаваў загадчыкам кафедры бактэрыялогіі ў жаночым медыцынскім інстытуце, чытаў курс бактэрыялогіі ў зубаўрачэбнай і фельчарскай школах. У гады першай сусветнай вайны – упаўнаважаны

Галоўнага камітэта Ўсерасійскага земскага саюза па арганізацыі хірургічных і эпідэміялагічных атрадаў (1914), узначальваў малярыйна-эпідэміялагічны атрад Усерасійскага земскага саюза на Каўказскім фронце, старшыня Каўказскага ваенна – санітарнага Савета (1915-1917).

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі быў у першых радах дзеячаў аховы здароўя. З 1917 па 1919 г. узначальваў першы бактэрыялагічны інстытут Наркамата аховы здароўя, а з 1919 г. прыступіў да арганізацыі Трапічнага інстытута, які быў адкрыты ў жніўні 1920 г. (зараз Інстытут малярыі, паразіталогіі і гельмінталогіі імя Марціноўскага). Быў нязменным дырэктарам гэтага інстытута да канца свайго жыцця. За гады работы арганізаваў шматлікія экспедыцыі ў рэспубліках Сярэдняй Азіі і Закаўказзя, вывучаў малярыю, лейшманіёз, розныя мясцовыя захворванні.

З 1923 па 1929 г. – арганізатар і загадчык кафедры інфекцыйных хвароб 2-га Маскоўскага медыцынскага інстытута, у 1924 г. быў у навуковай камандзіроўцы як член Малярыйнай камісіі Лігі Нацый у Італіі, а ў 1926 г. – у Італіі і Германіі.

На працягу многіх гадоў з'яўляўся членам вучонага медыцынскага Савета Наркамата аховы здароўя РСФСР, а з 1932 г. – яго старшынёй. Напісаў і апублікаваў звыш 200 навуковых прац.

Памёр 25 ліпеня 1934 г.

**Літаратура:**

Марціноўскі Яўген Іванавіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гістарычна-дакументальная хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 535 — 536.

## Красавік

### 110 год з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза, Ганчарова Якава Ігнатавіча



Нарадзіўся 05.04.1914 г. у вёскі Зялёнкі (ныне в. Казлоўка) Мсціслаўскага раёна. Член КПСС з 1942 г. У Чырвонай Арміі з 1931 г. Скончыў школу малодшых авіяспецыялістаў у 1937 г., курсы ўдасканалення афіцэрскага саставу (1951). Удзельнік баёў на р. Халхін-Гол у 1939 г. У Айчынную вайну з чэрвеня 1941 на Заходнем, Паўднёва-Заходнем, Сталінградскім, Данскім, Цэнтральным, Беларускім і 1-м Беларускім франтах. 24.06.1941 г. бамбіў варожыя войскі на шашы Гродна–Маладзечна. Даставуляў зброю і боепрыпасы партызанам злучэння С.А. Каўпака. Удзельнік вызвалення гарадоў: Харкава, Кіева, Гомеля,

Бабруйска, Мінска, Брэста, баёў на тэрыторыі Германіі. Начальнік сувязі авіяэскадрыллі ст. лейт. Ганчароў Я.І. зрабіў 221 баявы вылет на разведку і бамбардзіроўку ваеных аб'ектаў праціўніка, асабіста збіў 1 самалёт, 3 – у складзе групы.

15 мая прысвоена званне Героя Саветскага Саюза.

Да 1954 г. у Савецкай Арміі, маёр. Потым жыў і працаваў у Мсціславе. Памёр 26 сакавіка 1982 г.

**Літаратура:**


Ганчароў Я. І. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : Энцыклапедыя// Беларуская Савецкая Энцыклапедыя.—Мінскн, 1990.—С. 151.

Ганчароў Якаў Ігнатавіч. Героі Савецкага саюза – нашы землякі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальная хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск., 1999.—С. 247 — 248.

Гончаров Я. И. Герои Советского Союза: краткий биографический словарь в 2-х т. Т.1.—М., 1987.—С. 347.

Гончаров Яков Игнатьевич. Навечно в сердце народном : справочник.—3-е изд.—1984.—С. 122.

Гончаров Яков Игнатьевич. Герои Советского Союза – могилевчане.—Мінск, 1965.—С. 48 — 49.

Гасянкоў, У. Застаўся ў памяці жывых/ У. Гасянкоў, Ю. Ліўшыц.—Святло Кастрычніка.—1992.—12 жніўня.

Героі – нашы землякі //Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1975.—9 мая.

Грыгор'еў, Л. Пяты ордэн/ Л. Грыгор'еў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1973.—20 лістапада.

Кравцова, В. Мы вернулись с великой войны :23 марта исполняется 105 лет со дня рождения Якова Гончарова – легендарного Героя Советского Союза / Валентина Кравцова // Святло Кастрычніка.— 2019. — 21 сакавіка. —№ 21. —С. 3.

Резников, Я. Горячее небо/ Я. Резников // Знамя труда.—1974.—2 августа.

Резников, Я. Огненное небо/ Я. Резников // Знамя юности.—1974.—6 августа.

Рэзнікаў, Я. Салют, Познань!/ Я. Рэзнікаў// Магілёўскаяпраўда.—1974.—20 ліпеня.

Титов, И. Из орлиного племени/ И. Титов // Во славу Родины.—1975.—13 ноября.

Титов, И. "Спасибо за данные!"/ И. Титов// Сельская газета.—1978.—30 июля.

Цітоў, І. У небе франтавых/ І. Цітоў // Беларусь.—1974. — № 7.—С. 18 — 19.

## Май

### 95 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай Працы, Тарасевіч Лідзіі Кузьмінічны



Нарадзілася 01.05.1929 г. у вёскі Ракоўшчына Мсціслаўскага раёна. У 1974 г. атрымала званне Заслужанага настаўніка БССР. Член КПСС з 1963 г. Скончыла Мінскі педагагічны інстытут у 1972 г. З 1950 завуч Недальской 8-гадовай школы Бягомльскага раёна, з 1952 г. выкладчыца біялогіі ў СШ № 7, з 1964 г. завуч школы № 96 г. Мінска. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1978 г. за высокія паказчыкі ў навучна-выхаваўчай і грамадскай рабоце.

**Літаратура:**

Тарасевіч Лідзія Кузьмінічна // Беларуская ССР: кароткая энцыклапедыя.—1981.—Т. 5.—С. 595 — 596.

Тарасевіч Лідзія Кузьмінічна. Героі Сацыялістычнай Працы// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 499.

Куксёнок, Р. У истоков личности/ Р. Куксёнок // Труд, талант, доблесть:в 2-х ч. Ч. 2.—Минск, 1981. —С. 264 — 268.

### 155 год з дня нараджэння Беларускага кампазітара і фалькларыста, Чуркіна Мікалая Мікалаевіча

Нарадзіўся ў 21 мая 1869 г. Сцепанаван Армянскай ССР. Беларускі кампазітар і фальклaрыст.Скончыў Тбіліскае музычнае вучылішча Рускага музычнага таварыства (1892 г.), Пецярбургскую Акадэмію музыкі (1899 г.).

На Беларусі з 1914 г. Педагог настаўніцкай семінарыі і агульнаадукацыйных школ, арганізатар мастацкай самадзейнасці ў Мсціславе. З 1924 г. выкладчык педтэхнікума ў Магілёве, з 1935 г. – у Мінску.

Музыку Чуркіна вызначаюць аптымізм, строгая класічная форма, апора на беларускі фальклор, меладычнасць. Сярод твораў: опера “Вызваленне працы” (пастаўлена ў Мсціславе ў 1922 г., у некалькі перапрацаванай рэдакцыі пастаўлена сіламі самадзейных і прафесіянальных артыстаў у Магілёве ў 1924 г.), музычныя камедыі “Кок–сагмз” (1939, пастаўлена ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі ў 1939 г.), “Песня Бярэзіны” (1947, пастаўлена Бабруйскім музычна-драматычным тэатрам у 1947 г.). 3 сінфаньеты (1925, “беларускія карцінкі”, 1949, 1955). 11 струнных квартэтаў,

п’есы для фартэп’яна і скрыпкі з фартэп’яна, апрацоўкі народных песень і танцаў. Імем Чуркіна названа музычная школа ў Мсціславе.

**Літаратура:**

**Нотаграфія:**

Чуркін, М.М. Беларускія народныя песні / М.М. Чуркін: Запіс М. Чуркіна.—Мінск: Дзяржвыданне БССР, 1959.—163 с.

Чуркін, М.М. Беларускія народныя песні і танцы: Музычна-фалькорны зборнік/ М. М. Чуркін: Агульная рэдакцыя М. Аладава і М. Грынблата.—Мінск: Дзяржвыданне БССР, 1949.—190 с.

Чуркін, М.М. Выбраныя творы/ М.М. Чуркін.—Мінск: Дзяржвыданне БССР, 1960.—61 с.

Чуркін, М.М. Выбраныя творы/ М.М. Чуркін.—Мінск: Беларусь, 1965.—20 с.

Чуркін, М. Выбраныя творы/ М. Чуркін.—Мінск: Беларусь, 1969.—32 с.

Чуркін, М.М. Дзесяць фартэпіянных п’ес: Для малодшых классаў ДМШ/ М.М. Чуркін.—Мінск: Беларусь, 1963.—14 с.

Чуркин, Н.Н. Избранные произведения: для пения: соло,хор. с сопровождения фортепиано и без сопровождения/ Н.Н. Чуркин.—Минск: Беларусь, 1974.—24 с.

Чуркин, Н.Н. Песня без слов. Для скрипки и фортепиано/ Н.Н. Чуркин.—Минск: Госиздат, 1961.—6 с.

Чуркін, М.М. Родные напевы. Дзіцячыя п’есы для фартэпіано/ М.М. Чуркін.—Мінск: Беларусь, 1967.—11 с.

Чуркін, М.М. Тры песні/ М.М. Чуркін.—Мінск: Беларусь, 1964.—11 с.

**Фанаграфія:**

Чуркин, Н. Колыбельная/ Н. Чуркин: исполнение Государственного симфонического оркестра БССР, директор В. Дубровский. — С. 45.

Чуркин, Н. Белорусская полька, обр. Н. Прошко/Н. Чуркин: исполняет Октет балалаек г. Витебска. — С. 30.

Чуркин, Н. Полька/Н. Чуркин: исполняет Государственный оркестр народных инструментов, дирижер Н. Жинович// Звучат мелодии народов СССР. СМ-03363.

**Аб жыцці і творчасці:**

Мікалай Мікалаевіч Чуркін// БелСЭ.—1974.—Т.11.—С.235.

Мікалай Мікалаевіч Чуркін// Энцыклапедыя літаратура і мастацтва Беларусі.—1987.—Т.5.—С.532.

Николай Николаевич Чуркин// Музыкальная энциклопедия.—Москва, 1982.—Т.6.—С. 260.

Николай Николаевич Чуркин. Советские композиторы:краткий biобиблиографическийсправочник // составители Г. Бернард, А. Должанский.—Москва, 1957.—С.637.

Гісторыя беларускай савецкай музыкі.—Москва:Вышэйшая школа, 1971.—544 с.

Аб ім. глядзі с. 46, 47, 58,59, 64, 65, 69, 70, 73, 74, 76-78, 82, 83, 87, 91-93, 96, 100, 107, 109, 115, 123, 135, 162, 170, 171, 210, 283, 400, 486, 498, 500, 504.

История белорусской музыки.—Минск: Музыка, 1976.—247 с.: ил.

О нём см. С. 31, 32, 34, 37, 41-47, 49-51, 55, 58, 62, 65, 78, 97, 101, 102, 116, 117, 147, 203, 228, 233, 234.

Войценкаў, М. Не моўкне музыка кампазітара:М.М. Чуркін на Мсціслаўшчыне/ М. Войценкаў// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1962.—22 мая.

Войценкаў, М. Расказы аб кампазітару М.М. Чуркіну/ М. Войценкаў// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1970.—14 мая.

Дубкова, Т.А. Сімфаньета М. Чуркіна/ Т.А. Дубкова.—Мінск, 1974.—С. 5 — 12.

Жураўлёў, Дз. А песня застаецца жыць :да 100-годдзя з дня нараджэння М.М. Чуркіна/ Дз. Жураўлёў // Літаратура і Мастацтва.—1969.—23 мая.

Журавлёв, Д. Н.Н. Чуркин:к 95-летию со дня рождения композитора/ Д. Журавлёв// Советская музыка.—1964.—№5.—С. 143 — 144.

Жураўлёў, Дз. Чалавек прыгожай і шчырай душы:М.М. Чуркіну – 95 гадоў/ Дз. Жураўлёў// Літаратура і Мастацтва. — 1964. — 22 мая

Кубліцкі, У. Патрыярх музыкі : М. М. Чуркін жыў і працаваў у Мсціславе, 1914-1924 гг. / У. Кубліцкі // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1990. — 23 мая.

Малько, И. Истоки таланта : в народной творчасти : [в этом году исполнилось 150 лет  со дня рождения народного артиста , композитора, педагога, нашего земляка Николая Чуркина] / Ирина Малько // Святло Кастрычніка. – 2019. – № 72. – 28 верасня. – С. 6.

Ніскевіч, І. Цудадзей музыкі : да 100 – годдзя з дня нараджэння М. М. Чуркіна / І. Ніскевіч // Полымя. — 1969. — № 5. — С. 191 — 195.

Ножнікаў, М. Мікалай Чуркін:пра беларускага кампазітара. Працаваў уМагілёўскім педтэхнікуме/ М. Ножнікаў// Вестник Могилёва.—1993.—1 июля.—С. 6.

Ран, Г. Ацяпер яго слухае народ... :да 110 – годдзя з дня нараджэння М.М. Чуркина/ Г. Ран// Літаратура і МастацтваМ.—1979.—1 чэрвеня.—С. 13.

Смольскі, Б. Старэйшы кампазітар: М.М. Чуркін/ Б. Смольскі// Беларусь.—1954.—№5.—С. 20.

Тикоцкий, Е. Патриарх белорусской музыки: Н.Н. Чуркин/ Е. Тикоцкий// Нёман.—1969.—№5.—С. 179 — 180.

Ткачоў, М. М. Чуркін у Мсціславе/ М. Ткачоў// Беларусь.—1965.—№2.—С. 29.

Цітовіч, Г. Старэйшына беларускай музыкі: М.М. Чуркін/ Г. Цітовіч// Маладосць.—1969.—№5.—С. 121 — 124.

Цішчанка, І. Кампазітар М. М. Чуркін як фальклярыст/ І. Цішчанка// Беларусь.—1961.—№1.—С. 13.

Чуркін, М.М. Аўтабіяграфія/ М.М. Чуркін// Маладосць.—1969.—№5.—С. 119 — 121.

Чуркін у Мсціславе// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1968.—4 чэрвеня.

Чуркіна-Ткачонак, А. Мікалай Мікалаевіч Чуркін ў Мсціславе, А. Чуркіна-Ткачонак // Магілёўшчына.—Вып. 8.—Магілёў, 1998.—С. 71 — 76.

## Чэрвень

### 215 год з дня нараджэння рускага гісторыка, Куторгі Міхаіла Сямёнавіча

Нарадзіўся 06(18).07.1809, у г. Чэрыкаў Магілёўскай губерні. Рускі гісторык,член-карэспандэнт Расійскай АН (з 1849 г.). Скончыў Пецярбургскі універсітэт і Дэрпцкі прафесарскі інстытут. З 1835 г. выкладаў у Пецярбургскім, у 1869 – 1874 гг. у Маскоўскім універсітэтах. Вызначыўся выдатным веданнем крыніц, развіваў перадавыя для свайго часу прынцыпы іх вывучэння. Распрацоўваў вузлавыя праблемы сацыяльнай і палітычнай гісторыі архаічнай і класічнай Грэцыі, асабліва Афін. Упершыню ў сусветнай навуцы спрабаваў паказаць становішча непасрэдных вытворцаў – рабоў і вольнаадпушчаннікаў. Вядомыя таксама яго даследванні па пытаннях медыявістыкі і гісторыяграфіі. Разам з братам С.С. Кутаргам вёў значную культурна-асветніцкую работу сярод насельніцтва г. Мсціслава і яго ваколіц.

Памёр 26.05(07.06).1886.

**Літаратура:**

Куторга Міхаіл Сямёнавіч // Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальные хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 80.

### 135 год з дня нараджэння паэта і журналіста, Шастакова Паўла Пятровіча

Нарадзіўся 29 чэрвеня 1889 г. у мястэчку Манастыршчына Мсціслаўскага павета. Паэт і журналіст. З сялян. Скончыў Віцебскі настаўніцкі інстытут. Працоўную дзейнасць пачаў настаўнікам школы граматы ў 1906 г. З 1916 г. – у складзе 7-ай артылерыйскай брыгады ваяваў на румынскім фронце. У 1917 г. – у Маскве: прапаршчык 2-га запаснога

палка цяжкай артылерыйскай брыгады, удзельнік кастрычніцкага ўзброеннага паўстання. З 9 лістапада – член Маскоўскага Савета салдацкіх дэпутатаў.

У 1918–1919 гг. у Мсціславе: член павятовага выканкама і загадчык аддзела народнай асветы, рэдактар павятовай газеты "Думы бедняка". Удзельнічаў у грамадзянскай вайне.

З 1921 г. у Мінску: начальнік палітасветы Мінскага ваенкамата, намеснік старшыні Галоўпалітасветы Беларусі, галоўны інспектар па клубах і хатах-чытальнях. З верасня 1926 г. па жнівень 1928 г. у Маскве – загадчык беларускага сектара Камуністычнага інстытута нацменьшынстваў імя Ю.Б. Мархлеўскага. З верасня 1928 – па жнівень 1929 г. – намеснік наркама асветы БССР. З сакавіка па ліпень 1929 г. адказны рэдактар газеты "Савецкая Беларусь". З кастрычніка 1935 па жнівень 1936 г. – дырэктар Белдзяржвыдавецтва. Быў членам ЦВК БССР (1929–1932). Аўтар лібрэта першай оперы М.М. Чуркіна "Вызваленне працы", многіх вершаў і артыкулаў.

30 студзеня 1937 г. неабгрунтавана арыштаваны органамі НКУС, затым расстраляны. У 1956 г. рэабілітаваны пасмяротна.

**Літаратура:**

Шастакоў Павел Пятровіч: Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С.118.

## Ліпень

### 160 год з дня нараджэння беларускай народнай спявачкі, Гарэцкай Аўфрасінні Міхайлаўны

Нарадзілася 6 ліпеня 1864 г. у в. Малая Багацькаўка Мсціслаўскага павета. Беларуская народная спявачка. Маці пісьменніка М.І. Гарэцкага. Яе рэпертуар складаўся пераважна з сямейна-абрадавых і калядных песень, сярод якіх асаблівым багаццем вызначаліся радзінныя ("на хрэсьбіны"), вясельныя, веснавыя (гуканне вясны) і жніўныя. Песні ад яе запісвала дачка Ганна; найбольш поўны запіс яе рэпертуару зрабілі М. Гарэцкі і кампазітар А. Ягораў. Запісы (318 тэкстаў з мелодыямі) склалі асобную кнігу "Народныя песні з мелодыямі", выдадзеную Інкульбетам у 1928 г. Укладальнікі зборніка захавалі дыяліктычныя асаблівасці мовы песень Гарэцкай, перадалі адметнасць яе выканаўчага стылю. На аснове паасобных песень (Дзеўкі хмель садзілі", "Відзіць маё вочка" і інш.) М.Алданаў напісаў квінтэт для дзвюх скрыпак, альта, віяланчэлі і фартэпіяна.

Памерла 4 сакавіка 1935 г.

**Літаратура:**

Гарэцкая Аўфрасіння Міхалаўна: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі р-н: Гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі.—Мн., 1999.—С. 521.

**155 год з дня нараджэння беларускага паэта, архітэктара, Вітана – Дубейкаўскага (Дубейкоўскі) Лявона Іванавіча**

Нарадзіўся 07.07.1869 г., паводле інш. звестак 1867 г. в. Дубейкава Мсціслаўскага раёна – беларускі паэт, архітэктар.

Пасля заканчэння школы ў Мсціславе збіраўся прадоўжыць вучобу ў Магілёве, але ў бацькоў не было сродкаў вучыць сына, і яны ўладкавалі падлетка пісарчуком у горадзе. Гэтая пасада не вабіла юнака і ў 17 гадоў ён паехаў у Варшаву ў школу будаўніцтва. Вучыўся вечарамі, а ў дзень працаваў на будаўніцтве. Працаваў архітэктарам у Манастыршчыне, Ярцаве, Смаленску. Але цяга атрымаць вышэйшую адукацыю не пакідала яго: у 1903 г. экстэрнам здаў экзамены ў Пецярбургскі інстытут грамадзянскіх інжынераў. У 1907 г. паехаў у Парыж і паступіў у Акадэмію архітэктуры адразу на другі курс, закончыў яе ў 1909 г. са званнем “архітэктар-мастак”. Працаваў архітэктарам у Варшаве і адначасова выкладчыкам будаўніцтва ў сярэдняй тэхнічна-прамысловай школе. Затым пэўны час жыў у Петраградзе, Мінску.

Нарэшце пасяліўся ў Вільні, удзельнічаў у беларускім нацыянальна – культурным руху. У 1922 г. яго арыштавала польская паліцыя і вывезла ў Беласток, але хутка быў вызвалены. Зноў займаўся архітэктурай, шмат працаваў і будаваў, прымаў актыўны ўдзел у стварэнні малярскай школы, дзе вучыліся дзеці сялян-беднякоў.

Аўтар сацыяльна-вострых, накіраваных супраць царызму твораў: байка “Цягне воўк – пацягнуць воўка” (1892), якая з’яўляецца пераапрацоўкай вядомай народнай прыказкі, верш “Бура” (1893). Творы Вітана – Дубейкоўскага да Кастрычніцкай рэвалюцыі распаўсюджваліся толькі ў рукапісах. Аўтар прац па будаўніцтву і архітэктуры. Склаў зборнік беларускіх прыказак (рукапісы зберагаюцца ў цэнтральнай бібліятэцы АН Літоўскай Рэспублікі).

Памёр 06.11.1940 г.

**Літаратура:**

**Аб жыцці і творчасці:**

Вітан – Дубейкоўскі Лявон Іванавіч// Эцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі.—1984.—Т. 1.—С. 629.

Вітан – Дубейкаўскі Лявон// Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік : [у 6 т.].—Мінск, 1993.—Т.2. — С. 14-15.

Вітан – Дубейкаўскі (Дубейкоўскі) Лявон Іванавіч// Пісьменнікі Магілёўшчыны: бібліяграфічны паказальнік: [складальники: Новікава Н.А., Катлёнак А.А.].—Магілёў, 1993.—С. 34.

Вітан – Дубейкаўскі (Дубяйкоўскі) Лявон Іванавіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Минск, 1999.

Казека, Я. Няходжанай дарогай : крытычныянарысы/ Я. Казека.— Минск: Мастацкая літаратура, 1973.—271 с.

Клімуць, Я. Лявон Вітан – Дубейкаўскі / Я. Клімуць // Магілёўская праўда.—1989.—20 ліпеня.—(Анталогія літаратурнай Магілёўшчыны).

Мальдзіс, А. Дзве знаходкі/ А. Мальдзіс // Литаратура і Мастацтва. — 1969.—19 верасня.—С. 3.

Юрчанка, Г. Будаўнік і фалькларыст : Л. Вітан – Дубяйкоўскі/ Г. Юрчанка// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1984.—3 красавіка.

## 115 год з дня нараджэння спецыяліста ў галіне антычнай і сярэднявяковай археалогіі Узбекістана, Кабанава Сяргея Кузьміча

Нарадзіўся 9 ліпеня 1909 г. у Мсціславе. Адзін са старэйшых археолагаў Сярэдняй Азіі, вядомы спецыяліст у галіне антычнай і сярэднявяковай археалогіі Узбекістана.Пасля заканчэння педагагічнага тэхнікума ў Мсціславе ў 1929 г. паступіў на музейна–краязнаўчае аддзяленне Дзяржаўнага інстытута філасофіі, літаратуры і гісторыі. Тут вызначыўся напрамак яго навуковых інтарэсаў, аснову якіх складала мінулае народаў Сярэдняй Азіі. У 1933 г. пасля заканчэння інстытута прыехаў ва Узбекістан. У 1933–1941 гг. працаваў у ўзкамстрасе на пасадзе навуковага супрацоўніка і ўпаўнаважанага ў старажытных гарадах Шахрысабзе, Бухары. Прымаў актыўны ўдзел у рамонтна-рэстаўрацыйных работах па захаванні сярэдневяковых помнікаў Шахрысабза. Адначасова ажыццяўляў абследванне і фіксацыю археалагічных помнікаў Карынскага аазіса. У 1938 г. пад кіраўніцтвам В. А. Шышкіна ўдзельнічаў у раскопках гарадзішча Варахша. У 1941 г. і да прызыву ў Чырвонаю Армію працаваў у Бухарскім абласным музеі. З мая 1943 г. на франтах Вялікай Айчынай вайны. У званні лейтэнанта камандаваў узводам і ротай, быў цяжка паранены. Мае баявыя ўзнагароды. Са снежня 1945 г. працаваў у інстытуце гісторыі і археалогіі АН УзССР. Прымаў удзел у раскопках абсерваторыі Улугбека (1948), гарадзішчаў

Варахша (1951–1954), Афрасіаб (1959-1962, 1965-1970). Аднак асноўная работа ажыццяўлялася ў Даліне Кашкадар, дзе раскопкамі паселішча Каджартэпа (1947) і гарадзішча Ерхурган (1948) пачата сістэматычнае вывучэнне археалагічных помнікаў. У 1953 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме “Нахшеб в 3–8 веках в свете археологіческіх данных”. У 1982 г. ажыццяўляў палявыя даследванні гарадзішча Афрасіаб. Вынікі гэтай працы апісаў у 50 навуковых работах, сярод якіх дзве манаграфіі: “Нахшеб на рубеже древности и средневековья III-VIII вв.” (1977) і “Культура сельских поселений Южного Согда 3–8 вв.” (1981). У 1988 г. апублікаваў кнігу ўспамінаў, у якой расказаў пра свой 50-гадовы шлях у навуцы.

**Літаратура:**

Кабанаў Сяргей Кузьміч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 530.

## 90 год з дня нараджэнняЗаслужанага настаўніка БССР, Булашова Аляксандра Дзянісавіча

Нарадзіўся 27 ліпеня 1934 г. у сяле Дзяніскавічы Злынкаўскага раёна Бранскай вобласці ў сям’і калгаснікаў.У 1953 г. скончыў сярэднюю школу і паступіў у Беларускаю сельскагаспадарчую акадэмію,якую закончыў у 1959 г. Працаваў выкладчыкам у Чэрыкаўскім вучылішчы механізацыі сельскай гаспадаркі.З 1960 г. –выкладчык Мсціслаўскага вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі,з 1962 па 1965 г. –намеснік дырэктара па вучэбна – выхаваўчай рабоце ў СПТУ гарадскога пасёлка Друя Міёрскага раёна Віцебскай вобласці.З 1965 п 1985 г. зноў працаваў выкладчыкам Мсціслаўскага прафесіянальна–тэхнічнага вучылішча (СПТУ-49, перайменаванага ў ПТУ-218). Званне “Заслужаны настаўнік БССР’’ прысвоена ў 1975 г.

**Літаратура:**

Булашоў Аляксандр Дзянісавіч: Заслужаныя настаўнікі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 511.

## 110 год з дня нараджэння доктара тэхнічных навук, прафесара, Жунінай Ларысы Александраўны



Нарадзілася ў ліпені 1914 г. у Мсціславе. Вучоны ў галіне тэхналогіі матэрыялаў, доктар тэхнічных навук, прафесар. Скончыла Беларускі політэхнічны інстытут (1938). Працавала на шклозаводзе ў пасёлку Вялікая Вішэра пад Ленінградам. У пачатку вайны пераехала з прадпрыемствам на Волгу, працавала начальнікам цэха на Борскім шклозаводзе.

З 1946 г. Л. А. Жуніна ў Мінску – працавала інжынерам, асістэнтам на кафедры сілікатаў БПІ, вучылася ў аспірантуры. У 1950 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю, а ў 1968 г. доктарскую на атрыманне вучонай ступені доктара тэхнічных навук. Па тэме дысертацыі “Даследванне і сінтэз піраксенавых сіталаў” апублікавала 46 артыкалаў і паведамленняў. Падагульненнем яе шматгадовай працы па сіталах з’явілася кніга “Піраксенавыя сіталы” (1974), у якой намечаны шляхі распрацоўкі новых відаў гэтага матэрыялу на аснове недыфкцытнай сыравіны і шлакаў.

З 1970 г. –прафесар кафедры тэхналогіі сілікатаўБПІ, а з 1976 г. прафесар той жа кафедры Беларускага тэхналагічнага інстытута. Ёй належыць больш за 250 друкаваных прац і каля 20 аўтарскіх пасведчанняў. Была членам спецыялізаваных саветаў па прысуджэнні вучоных ступеней кандыдата і доктара навук.

Памёрла ў 1981 г.

**Літаратура:**

Жуніна Ларыса Аляксандраўна: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 528.

## Жнівень

## 70 год з дня нараджэння Беларускага археолага і гісторыка архітэктуры, публіцыста, Трусава Алега Анатольевіча



Нарадзіўся 7 жніўня 1954 г. у Мсціславе. Беларускі археолаг і гісторык архітэктуры, публіцыст. Скончыў БДУ (1976). Кандыдат гістарычных навук (1981). З 1976 г. супрацоўнік, з 1988 г. – начальнік архілагічнага аддзела Беларускага рэстаўрацыйнага праектнага інстытута, з 1 кастрычніка 1991 г. намеснік старшыні Камісіі па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчаны Вярхоўнага Савета

Рэспублікі Беларусь. Вывучае помнікі манументальнага дойлідства, матэрыяльную культуру Беларусі 11–18 ст., гісторыю будаўнічай тэхнікі, эвалюцыю асноўных тыпаў муровак і будаўнічых матэрыялаў з цэглы, дахоўкі, плітак падлогі, каменю і кафлі Беларусі. Распрацаваў методыку архітэктурна – археалагічнага вывучэння манументальных помнікаў. Праводзіў раскопкі Гродзенскага (Старога), Заслаўскага,

Крэўскага, Лідскага, Мазырскага, Мірскага замкаў, Барысаглебскай царквы ў Навагрудку, Благавешчанскай ў Віцебску, Каложскай у Гродне, Магілёўскай ратушы, помнікаў архітэктуры Мсціслава 17–18 ст. і інш. Аўтар кніг “Помнікі старажытнага Мсціслава” (разам з Р.В. Баравым, 1985 г.), “Памятники монументального зодчества Белоруссии 11–17 вв.: “Архитектурно–археологический анализ” (1988), “Старадаўніх муроў адраджэнне. Мінулае і сучаснае Лідскага замка” (1990 ) і інш.

**Літаратура:**

**Асноўныя навуковыя працы:**

Манументальнае дойлідства Беларусі 11–18 стагоддзяў. Гісторыя будаўнічай тэхнікі.—Мінск: ТАА “Лекцыя”, 2001.—204 с.: іл.

**Аб жыцці і навуковай дзейнасці:**

раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.— Мінск, 1999.— С. 541.

## 105 год з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза, Качанава Яўгена Іванавіча



Нарадзіўся 20.08.1919 г. у вёскі Доўгавічы Мсціслаўскага раёна. У Чырвонай Арміі з1939 г. З 1942 г. на Крымскім, Цэнтральным і 1-м Украінскім франтах. Камандзір стралковага аддзялення сяржант Качанаў Яўген Іванавіч вызначыўся ў баях на Одэры. 27.01.1945 г. аддзяленне на чале з Качанавым першае фарсіравала раку і ў баі за расшырэнне плацдарма знішчыла каля 100 гітлераўцаў. Цяжка паранены Качанаў Я. І. не пакінаў поля бою. 28.01.1945 г. асабістым прыкладам падняў воінаў у атаку. Загінуў у гэтым баі. Яго імем названа вуліца ў г. Магілёве; на будынку Доўгавіцкай сярэдняй школы мемарыяльная дошка.

Указам Прэзідыўма Вярхоўнага Савета Саюза ССР ад 10 красавіка 1945 г. тав. Качанаву Яўгену Іванавічу пасмертна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Загінуў 28.01.1945 г.

**Літаратура:**

Качанаў Яўген Іванавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: энцыклапедыя/ Беларуская Савецкая Энцыклапедыя.—Мінск, 1990.—С. 261.

Качанаў Яўген Іванавіч// Энцыклапедыя Гісторыі Беларусі: Т. 6.—Мінск, 1997.—С. 156 — 157.

Качанаў Яўген Іванавіч: Героі Савецкага Саюза – нашы землякі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 250 — 251.

Качанаў Яўген Іванавіч// Каляндар знамянальных і памятных дат па Магілёўскай вобласці на 1999 год.—Магілёў., 1999.—С. 46.

Качанов Е. И. Герои Советского Союза: Краткий биографический словарь : [в 2-х т.].—Минск, 1987.—Т. 1. — С. 640.

Качанов Евгений Иванович. Навечно в сердце народном: Справочник.—3-е изд.—Минск,1984.—С. 220.

Качанов Е. И. Их именами названы: энциклопедическийсправочник.—Минск, 1987.—С. 265.

Качанов Евгений Иванович. Герои Советского Союза могилевчане.—Минск, 1965.—С. 67 — 68.

Героі – нашы землякі //Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1975.—9 мая.

Грыгор'еў, Л. Вясна на Одэры/ Л. Грыгор'еў //Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1980.—27 сакавіка.

Запявала //Магілёўскаяпраўда.—1970.—23 ліпеня.

Кубліцкі, В. Памятаем цябе, зямляк!/ В. Кубліцкі // Магілёўская праўда.—1980.—24 верасня ; Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1980.—9 мая.

Ліўшыц, Ю. Быў чутны подых мая/ Ю. Ліўшыц //Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1973.—3 ліпеня.

Санько, В. Запявала/ В. Санько //Звязда.—1970.—13сакавіка.

Іваноў, Л. Подзвіг Яўгенія Качанава/ Л. Іваноў //Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1982.—18 снежня.

## 100 год з дня нараджэння вучонага, хірурга, педагога, доктара медыцынскіх навук, прафесара, Астапенкі Вадзіма Рыгоравіча



Нарадзіўся 17 жніўня 1924 г. у в. Шамава Мсціслаўскага раёна ў сям'і фельчара. Вучоны, хірург, педагог, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Удзельнік Вялікай Айчынай вайны з кастрычніка 1943 г.

Скончыў Мінскі медыцынскі інстытут з адзнакай (1953). З верасня 1953 г. вучыўся ў аспірантуры пры кафедры факультэцкай хірургіі , у 1957 г. абараніў кандыдацкую

дысертацыю, у 1965 г. дацэнт, у 1972 г. – доктар медыцынскіх навук, у 1973 г. – прафесар. З 1957 г. працаваў у Мінскім інстытуце дэканам лячэбнага факультэта. З верасня 1975 па студзень 1978 г. загадчык кафедры хірургіі Беларускага інстытута ўдасканалення настаўнікаў, з 1978 г. – загадчык штампрофільнай клінікі Мінскага медыцынскага інстытута. Адначасова быў па сумяшчальніцтву галоўным хірургам Міністэрства аховы здароўя БССР.

В. Р. Астапенка – вучоны, хірург у галіне эндакрыналогіі, аўтар больш за 200 навуковых прац, у тым ліку 12 манаграфій. Ім распрацаваны і ўкаранёны ў лячэбную практыку новыя высокаэфектыўныя метады абязбольвання і пасляаперацыйнага лячэння хворых таксічным зобам.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Славы III ступені, медалямі "За адвагу", "За баявыя заслугі", Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Памёр 22 снежня 1989г.

**Літаратура:**

Гасянкоў, У.Л. Астапенка Вадзім Рыгоравіч: Знакамітыя людзі / У.Л. Гасянкоў// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 517.

## Верасень

### 90 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай працы, Самусева Аляксандра Іванавіча

Нарадзіўся 25 верасня 1934 г. у в. Парадзіна Мсціслаўскага раёна ў сям'і калгасніка. Скончыў пачатковую школу ў 1950 г. і застаўся працаваць у родным калгасе "1 Мая". Пасвіў калгасных коней, жывёлу. З 1954 г. працаваў на адкорме буйной рагатай жывёлы, з 1962 г. – даглядчыкам жывёлы, з 1969 г. – скотнікам-пастухом.

За поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі ўзнагароджаны ордэнам Леніна, медалём "За працоўную доблесць".

Памёр 7 студзеня 1998 г.

**Літаратура:**

Самусеў Аляксандр Іванавіч: Узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 507.

## Кастрычнік

### 175 год з дня нараджэння рускага астранома, Дубягі Дзмітрыя Іванавіча.

Нарадзіўся 03.10.1849. в. Соіна Мсціслаўскага павета. Рускі астраном. Скончыў у 1872 г. Пецярбургскі ўніверсітэт. Працаваў у Пулкаўскай астранамічнай абсерваторыі. У 1884–1918 гг. – дырэктар Казанскай абсерваторыі, з 1901 г. – дырэктар заснаванай ім паблізу Казані абсерваторыі імя Энгельгарта. У 1899–1905 гг. – рэктар казанскага ўніверсітэта. Навуковыя працы па тэарытычнай астраноміі, астраметрыі і гравіметрыі. Даследваў арбіту спадарожніка Нептуна, стварыў тэорыю руху малой планеты. Па назіраннях казанскіх астраномаў склаў каталог 4281 зоркі.

Памёр 22.10.1918.

**Літаратура:**

Дубяга Дзмітрый Іванавіч : [Астраном] // Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 78.

### 135 год з дня нараджэння Дзяржаўнага дзеяча, вучонага медыка, дацэнта, Родава Якава Іосіфавіча



Нарадзіўся 20 кастрычніка 1889 г. у Мсціславе. Дзяржаўны дзеяч,вучоны медык, дацэнт.

Скончыў гімназію ў Рослаўлі (1911), медыцынскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта (1919). З 1919 па 1922 г. у Мсціславе: член Мсціслаўскага паветвыканкама, загадчык лячэбнага аддзела аховы здароўя. З 1923 па 1929 г. у Смаленску: загадчык лячэбнага пададзела аховы здароўя, загадчык медыцынскай часткі.

З 1929 па 1938 г. працаваў у Маскве ў Дзяржплане РСФСР. Прымаў удзел у распрацоўцы планаў аховы здароўя трох першых пяцігодак. З сакавіка 1938 па 1940 г. працаваў начальнікам сектара аховы здароўя Дзяржплана пры СНК РСФСР.

У гады вайны ўзначаліў аддзел арганізацыі і медыка-санітарнай дапамогі рабочым абароннай прамысловасці Наркамата аховы здароўя РСФСР. З 1942 г. – дацэнт кафедры арганізацыі аховы здароўя 1-га Маскоўскага інстытута . З 1955 г. Родаў сумяшчаў выкладчыцкую дзейнасць з работай па рэдакцыі Вялікай медыцынскай энцыклапедыі ў якасці вучонага сакратара аддзела сацыяльнай гігіены і арганізацыі аховы здароўя.

Аўтар звыш 500 работ па розных аспектах тэорыі і практыкі аховы здароўя. Найбольш значныя з іх: “Методыка і практыка планіравання аховы

здароўя” (1940), “Здраўпункт у барацьбе з захворваемасцю на вытворчасці”(напісана сумесна з Н. А. Семашка(1944)), “Планаванне і фінансаванне аховы здароўя” (1955).

Узнагароджаны двума ордэнамі “Знак Пашаны ”, медалямі.

**Літаратура:**

Родаў Якаў Іосіфавіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 538.

## Лістапад

### 110 год з дня нараджэння беларускага пісьменніка, Левановіча Паўла Антонавіча

У змаганні з нямецка-фашыскімі захонікамі загінуў малады беларускі пісьменнік, наш зямляк Павел Антонавіч Левановіч.

Нарадзіўся ён 3 лістапада 1914 года ў в.Мазалава. Было звычайнае дзяцінства вясковага хлапчука. Дапамога бацькам па гаспадарцы, вучоба ў пачатковай школе. У 1924 годзе сям’я перабралася на хутар ва ўрочашча Клышкіна, што прыкладна ў кіламетры на поўнач ад вескі. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Мсціславе ў так званай “бурдзілаўцы”. Затым вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце на геаграфічным факультэце.

Першыя яго мастацкія творы з’явіліся ў друку ў 1934. Малады празаік імкнуўся паказаць светапогляд, мысленне, моманты сталення новага чалавека. Характэрнае ў гэтым плане апавяданне “На Сожы”. Аўтар пераканальна паказаў, як пад уздзеяннем калектыву перавыхоўваецца чалавек, грамадскія інтарэсы набываюць для яго рашаючае значэнне. Пісаў таксама вершы.

Найбольшы плён яму апавяданні для дзяцей. У 1938 годзе выйшаў з друку яго зборнік “Дружба”. Пісьменнік паказаў сяе нядрэнным знаўцам дзіцячай псіхалогіі. Многія яго творы не страцілі пазнавальнага і выхаваўчага значэння і ў наш час. У яго апавяданнях трапныя пейзажныя замалеўкі, трапяткая шчырасць, любоў да ўсяго жывога на зямлі.

Часта выступаў Павел Левановіч як публіцыст. Ён расказаў пра жыцце народаў нашай краіны, шмат увагі ўдзяляў землякам-мсціслаўцам. Таксама выступаў у друку па пытыннях мастацтва, расказваў пра творчыя дасягненні акцёраў. У 1939 годзе малады пісьменнік удзельнічаў у вызваленчым паходзе ў Заходнюю Беларусь. На старонках розных газет расказваў пра першыя крокі новага жыцця на заходнебеларускай зямлі.

У 1940 годзе пісьменнік падрыхтаваў другі зборнік апавяданняў. У Саюзе пісьменнікаў рукапіс быў абмеркаваны. Выказваліся многія

літаратары, у тым ліку вопытны майстар слова Змітрок Бядуля. Рукапіс зборніка загінуў у полымі вайны.

Драматычным аказаўся лёс пісьменніка на пачатку вайны. Ён выбраўся з палаючага Мінска, але апярэдзіць фашысцкую нечысць не ўдалося. Павел трапіў у Крычаўскі лагер ваеннапалонных. Уцекшы адтуль, дабраўся да роднай вёскі. Неўзабаве звязаўся з мсціслаўскім падполлем, зрабіў весткі пра ворагаў, дапамагаў партызанам. У пачатку кастрычніка 1943 г. пайшоў у Чырвоную Армію. Есць паведамленні, што той жа восенню змяшчаў допісы ў франтавым друку. У снежні таго ж года быў цяжка паранены ў баю і 20 снежня памер у шпіталі ад ран.

Пра яго творчасць неаднаразова разказвалася ў беларускім перыядычным друку. Яго імя ўвекавечаны на мемарыяльнай дошцы ў назве вуліцы горада Мсціслава. Асобныя апавяданні друкаваліся на старонках газеты “Святло Кастрычніка”.

**Літаратура:**

**Аб жыцці і творчасці:**

Лeвановіч Павел Антонавіч// Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 6 т.—Мінск, 1986.—Т. 3. — С. 211.

Лeвановіч Павел Антонавіч// Пісьменнікі Магілёўшчыны: бібліяграфічны паказальнік: [складальнікі: Новікава Н.А., Катлёнак А.А.]—Магілёў, 1993.—С. 145 — 146.

Павел Левановіч// Пісьменнікі Савецкай Беларусі.—Мінск, 1981.—С. 207.

Павел Левановіч// Ішла вайна народная...: беларуская пісьменнікі ў Вялікай Айчыннай.—Мінск, 1991.—С. 401 — 404.

Клімуць, Я. Павел Левановіч/ Я.Клімуць // Магілёўская праўда.—1991.—6 красавіка.—(Анталогія літаратурнай Магілёўшчыны).

Юрчанка, Г. Ён назаўсёды застаўся малады/ Г. Юрчанка// Літаратура і Мастацтва.—1965.—20 жніўня.—С. 3.

Юрчанка, Г. Малады назаўсёды/ Г. Юрчанка// Чырвоная Змена.—1989.—2 лістапада.—С. 8.

Юрчанка, Г. Новае пра Паўла Левановіча/ Г. Юрчанка// Літаратура і Мастацтва.—1978.—7 красавіка.—С. 7.

## 90 год з дня нараджэння дацэнта кафедры беларускай мовы, Падгайскага Леаніда Пракопавіча



Нарадзіўся 25 лістапада 1934 г. у Ленінградзе ў сям’і рабочых-беларусаў, якія праз год вярнуліся на радзіму ў Мсціслаў. У 1953 г. скончыў Мсціслаўскае педвучылішча. Настаўнічаў. У 1962 г. скончыў Магілёўскі педагагічны

інстытут. Кандыдат філалагічных навук (1980). Працаваў у Мінскім педагагічным інстытуце імя Горкага старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры беларускай мовы, намеснікам дэкана, дэканам, прарэктарам па вучэбнай рабоце.

Даследваў сінтаксіс беларускай мовы і методыку яе выкладання у пачатковых класах. У манаграфіі "Словазлучэнне у беларускай мове: Дзеяслоўна-імянныя словазлучэнні з акалічнаснымі адносінамі". Л.П. Падгайскі разглядаў сістэму дзеяслоўна-іменных словазлучэнняў з прасторавымі, часовымі, прычыннымі і мэтавамі адносінамі, высвятляе ролю галоўнага і залежнага кампанентаў гэтых словазлучэнняў, а таксама прыназоўнікаў і суадноснасць іх з прыстаўкамі дзеясловаў прэфіксальнага ўтварэння.

Памёр Леанід Пракопавіч Падгайскі 4 жніўня 1980 года.

**Літаратура:**

**Асноўныя навуковыя працы:**


Арфаграфічны слоўнік : для пачатковых класаў/ Навуковы рэдактарЛ.П. Падгайскі.—5-е выд.—Мінск: Народная асвета, 1987.—168 с.

Беларуская мова:падручнікдля 2-га класа школ з беларускай мовай навучання/ Л.П. Падгайскі і інш.—5-е выд.—Мінск: Народная асвета, 1995.—206 с.: іл.

Кавалёва М.Ц., Падгайскі Л.П. Беларуская мова:дапаможнікдля вучняў старэйшых класаў.—5-е выд., дапрац.—Мінск: Народная асвета, 1991.—271 с.

Падгайскі Л.П., Малашкевіч С.С., Будзько В.Я. Беларуская мова:падручнікдля 3 класаў.—9-е выд.—Мінск: Народная асвета, 1987.—159 с.: іл.

Падгайскі Л.П., Севярнёва А.К. Беларуская мова:падручнікдля 2 класаў.—10-е выд.—Мінск: Народная асвета, 1987.—159 с.: іл.

Беспрыназоўнікавы родны часу у беларускай мове// материалы научно-теоретической конференции:тезисный доклад.—Минск, 1965.—С. 300 — 305.

Да характарыстыкі сінтаксісу народных гаворак// Лінгвістычны зборнік:артыкулы, паведамленні, матэрыялы.—Мінск, 1965.—С. 152 — 166.

Каўрус, А., Падгайскі, Л. Знаходзіць той, хто шукае/ А. Каўрус, Л. Падгайскі// Полымя.—1965.—№1.—С. 166 — 169.

Некаторыя асаблівасці дзеяслоўнага кіравання// Народная асвета.—1965.—№8.—С. 50 — 53.

Беларускае мовазнаўства:бібліяграфічны паказальнік (1966-1975)/ складальнікі : А.Д. Васілеўская, Я.М. Рамановіч.—Мінск: Навукаі тэхніка, 1980.—350 с. (Гл. імянны паказ.).

Беларускае мовазнаўства: бібліяграфічны паказальнік (1976-1985)/ Складальнікі : А.Д. Васілеўская, Я.М. Рамановіч.—Мінск, 1993.—559 с. (Гл. імянны паказ.).

Методыка выкладання беларускай мовы:бібліяграфічны паказальнік (1969-1990)/ Склад. М.С. Лукошус.—Мінск: Вышэйшая школа, 1993.—109 с. (Гл. імянны паказ.).

**Аб жыцці і навуковай дзейнасці:**

Падгайскі Л.П. Беларуская мова:энцыклапедыя.—Мінск, 1994.—С. 397.

Падгайскі Л.П. Энцыклапедыя літаратура і мастацтва Беларусі :у 5 т.—Мінск, 1987.—Т. 4. — С. 134.

Падгайскі Л.П Мовазнаўцы Магілёўшчыны: бібліяграфічны паказальнік.—Магілёў, 1998.—С. 51 — 52.

Падгайскі Леанід Пракопавіч:Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў.—Мінск, 1999.—С. 537.

Вайцянкоў, М. Л.П. Падгайскі – вучоны мовазнаўца/ М. Вайцянкоў// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1975.—19 жніўня.

Гасянкоў, У. Вучыў спасцігаць родную мову/ У. Гасянкоў// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1998.—11 красавіка.

Германовіч, І. Леанід Падгайскі/ І. Германовіч// Роднае слова.—1994.—№11.—С. 54.

Янкоўскі, Ф. Слова настаўніка пра вучня/ Ф. Янкоўскі// Магілёўская праўда.—1979.—28 ліпеня.

Янкоўскі, Ф.М. Вучоны і педагог/ Ф.М. Янкоўскі// Савецкінастаўнік.—1977.—18 студзеня.

## Снежань

### 100 год з дня нараджэння Заслужанага настаўніка БССР,Салдаткінай Анастасіі Пятроўны

Нарадзілася 29 снежня 1924 г. у в. Сапрынавічы Мсціслаўскага раёна ў сялянскай сям'і. У 1945 г. скончыла Мсціслаўскае педвучылішча. Працавала настаўніцай у Рэдзькавічскай пачатковай школе на Маладзечаншчыне, з 1947 г. – настаўніцай у Янаўскай, Сапрынавіцкай пачатковых школах і Віхранскай 8-гадовай школе (да 1980 г.) у Мсціслаўскім раёне. Званне "Заслужаны настаўнік БССР" прысуджана ў 1971 г. Узнагароджана Ганаровай граматай Міністэрства асветы.

Памёрла 26 жніўня 1994 г.

**Літаратура:**

Салдаткіна Анастасія Пятроўна: Заслужаныя настаўнікі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 514.

## 150 год з дня нараджэння рускай і беларускай скрыпачкі, кампазітара і педагога, Бязроднай Яўгеніі Рыгораўна



Нарадзілася ў 1874 г. у г. Мсціславе. Руская і беларуская скрыпачка, кампазітар і педагог. Пасля заканчэння Пецярбургскай кансерваторыі працавала ў аркестры Марыінскага тэатра ў Пецярбургу. Па рэкамендацыі А. Рубенштэйна і П. Чайкоўскага спрабавала дырыжыраваць. У 1906 г. напісала фартэпіянную п’есу з дэкламацыяй “Песня пра Буравесніка”, прысвяціла яе М. Горкаму. Была выхавальніцай дзяцей І. Рэпіна. Вярнуўшыся на радзіму, выкладала музычныя дысцыпліны ў Мсціслаўскім педагагічным вучылішчы.

Памерла ў 1942 годзе.

**Літаратура:**

Яўгенія Рыгораўна Бязродная// Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі.—1984.—Т. 1.—С. 541.

Бязродная Яўгенія Рыгораўна. Выдатныя дзеячы музычнага мастацтва Магілёўшчыны : біябібліяграфічны паказальнік; [складальнік Цыбулёва Н.М.].—Магілёў, 1993.—С. 7 — 8.

Бегуновіч, А. Лёс Яўгеніі Бязроднай: дачка твая Мсціслаўшчына/ А. Бегуновіч // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1990.—4 верасня.

Бегуновіч, А. Лёс Яўгеніі Бязроднай: музыкант з Мсціслава/ А. Бегуновіч// Магілёўская праўда.—1990.—28 ліпеня.

Мельников, М. Автор музыки к “Песне о Буревестнике”: Е. Безродная/ М. Мельников// Нёман.—1962.—№3.—С. 158 — 160.

Мельнікаў, М. Аўтар мелодыі “Песня пра Буравесніка” – наша зямлячка: Е. Бязродная/ М. Мельнікаў// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1980.—2 кастрычніка.

Пыліна, А. Цікавая старонка мінулага: аб першай музыцы да горкаўскай “Песні пра Буравесніка”, Я. Бязродная/ А. Пыліна, А. Малочка // Літаратура і Мастацтва.—1968.—12 красавіка.

Ялугін, Э. Аўтар музыкі да “Песні пра Буравесніка”: Я. Бязродная/ Э. Ялугін// Калгасная газета (Мсціслаў).—1959.—15 студзеня.

Ялугин, Э. Чудесный сад музыкі: о музыканте к композиторе Е.Г. Безродной/ Э. Ялугин, В. Бобрович // Знамя юности.—1960.—18 декабря.

## 115 год з дня нараджэння вучонага, паэта, кандыдата філалагічных навук, Гоманава Івана Цярэнцьевіча



Нарадзіўся ў 1909 г. у в. Віхраны Мсціслаўскага павета ў сям'і селяніна. Вучоны, паэт, кандыдат філалагічных навук. У 1930 г. скончыў Мсціслаўскі педтэхнікум. У час вучобы друкаваў свае вершы ў газетах і часопісах. Член літаратурнай арганізацыі "Маладняк" (1927–1930) пры педагагічным тэхнікуме. Там была напісана першая лірычная паэма "Фея". У 1930–1933 гг. працаваў настаўнікам у мястэчку Крупкі Мінскай вобласці. Закончыў педагагічны інстытут імя Герцена ў Ленінградзе, а затым аспірантуру пры гэтым інстытуце, працаваў загадчыкам кафедры рускай мовы Пскоўскага педагагічнага інстытута. У гады Вялікай Айчынай вайны служыў у Краснаярску, дзе друкаваў вершы ў вайсковых газетах. У навуковых працах «Псковские говоры» (два тамы за 1962 і 1968 гг.) змешчаны два вялікія артыкулы Гоманава. Прымаў удзел у складанні Пскоўскага абласнога слоўніка.

**Літаратура:**

Гоманаў Іван Цярэнцьевіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 524 — 525.

## 105 год з дня нараджэння кіраўніка партызанскага руху, Казанкова Паўла Еўдакімавіча

Нарадзіўся ў 1919 г. у Хакасіі. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Смаленскай і Магілёўскай абласцях. Працаваў настаўнікам сярэдняй школы. У 1939 г. прызваны ў чырвоную армію. На фронце з 9 ліпеня 1941 г. у складзе 544-га стралковага палка, які займаў абарону ў30 км ад Смаленска, потым у раёне станцыі Гусіна. У раёне Курдымава трапіў у акружэнне. Перайсці лінію фронта не ўдалося. З групай савецкіх воінаў застаўся ў Манастыршчынскім раёне Смаленскай вобласці. Арганізаваў партызанскую групу. У маі 1942 г. група ўвайшла ў атрад "Чапай", які дзейнічаў на тэррыторыі Дрыбінскага і Мсціслаўскага раёнаў Магілёўскай вобласці, Манастыршынскага і Хіславіцкага раёнаў Смаленскай вобласці. Быў камандзірам гэтага атрада.

**Літаратура:**

Казанкоў Павел Еўдакімавіч: Партызанскія камандзіры// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 207 — 208.

## 90 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай працы, Кандраценкі Мікалая Кандратавіча



Нарадзіўся ў 1934 г. у в. Бізюкі Мсціслаўскага раёна ў сям'і рабочых. У 1948 г. скончыў 4 класы Жарацінскай сямігадовай школы. Працоўную дзейнасць пачаў у 1949 г. прыцэпшчыкам Тэльманаўскай МТС, там жа скончыў курсы трактарыстаў. З 1950 г. працаваў трактарыстам МТС, з 1955 г. служыў у Савецкай Арміі. Пасля звальнення ў запас у 1958 г. працаваў трактарыстам у калгасе "Шлях камунізма", з 1965 г. – трактарыстам у саўгасе "Мсціслаўскі".

За поспехі ў павелічэнні сельскагаспадарчай вытворчасці і праяўленую працоўную доблесць на ўборцы ўраджаюўзнагароджаны ордэнам Леніна (1972), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971).

**Літаратура:**

Кандраценка Мікалай Кандратавіч: Узнагароджаныя ордэнамі Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 503 — 504.

## 125 год с дня нараджэння Героя Сацыялістычнай працы, Напрэева Фядоса Радыёнавіча

Нарадзіўся ў 1899 г. у в. Сялец Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям'і. З верасня 1919 г. у Чырвонай Арміі, а з лютага 1920 г. – у складзе 504-га пяхотнага палка 56-ай стралковай дывізіі. Пасля грамадзянскай вайны працаваў у сельскай гаспадарцы. У 1930 г. разам з іншымі аднавяскоўцамі стварыў у в. Сялец калгас "Чырвоная Зорка", быў яго старшынёй. З 1939 г. па 1941 г. – старшыня Дудчыцкага сельскага Савета.

У Айчынную вайну на фронце: з чэрвеня 1941 г. па май 1945 г. Пасля дэмабілізацыі ў 1945 г. вярнуўся на радзіму і працаваў старшынёй Дудчыцкага сельскага Савета, з 1952 г. – старшынёй калгаса "Чырвоны Сялец". Калгас, які ён узначальваў, займаў адно з першых месцаў у раёне.

Узнагароджаны ордэнам Леніна (1958), медалямі "За адвагу", "За абарону Ленінграда" і іншымі.

**Літаратура:**

Напрэеў Фядос Радыёнавіч: Узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 506.

**390 гадоў** з часу атрымання магдэбурскага права і герба г Мсціслаўлем (1634).
**27 ліпеня 100 гадоў** з дня ўтварння Мсціслаўскага раёна (1924).

## З гісторыі вёсак

З нагоды юбілеяў вёсак раім аформіць бібліятэчныя выставы, тэматычныя паліцы на тэмы: "Гісторыя і сучаснасць роднага краю", "Ён Радзімаю завецца-непаўторны гэты край", "Край, дзе мы жывём", "Каранямі я з роднай зямлі", "Вёска, у якой я жыву", "Зямля бацькоў – жыцця крыніца", "Зямля, дзе пачаўся наш лёс", "Вёска мая, я часцінка твая", "Непаўторная, адзіная, малая Радзіма", "Зямля бацькоў – зямля святая", "Я вырас тут, і край мне гэты любы" і інш.

Падрыхтаваць мерапрыемствы, гадзіны знаёмстваў, краязнаўчыя гадзіны, урокі пазнання, урокі бацькаўшчыны, краязнаўчыя вандроўкі на тэмы: "Знакамітыя людзі нашай вёскі", "Ці ведаеш ты сваю вёску?", "За што я люблю сваю вёску", "Тут табе пашчасціла жыць і нарадзіцца", " Наша малая радзіма-роднае сяло", "Мой родны, мілы край", "Край бацькоўскі – мая глабінка", "Наша вёска раней і зараз", "Зямля іх наша ўзгадавала" і інш.

**АСЛЯНКА** – вёска ў Сапрынавіцкім сельсавеце, за 10 км ад Мсціслава, на р. Аслянка.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 17 ст. У 1654 г. с. Асланца аддадзена Мсціслаўскаму кармеліцкаму кляштару. У 1667 г. пабудаваны вадзяны млын, у 1737 г. – царква. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1785 г. ў Мсціслаўскім павеце Магілеўскага намесніцтва, 31 двор, 150 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1867 г. заснавана сукнавальня, у 1910 г. адкрыта вінная крама. У 1885 г. – цэнтр воласці ў Мсціслаўскім павеце. Зямля належыла Пустынскаму манастыру. Мелася школа (народнае вучылішча), адкрытая не пазней 1884 г. У канцы 18 ст. ў цэнтры вёскі пабудавана драўляная царква, якая з'яўляецца помнікам народнага дойлітдства. Паводле перапісу 1897 г. 29 двароў, 185 жыхароў. Побач былі царкоўная сядзіба (2 двары, 14 жыхароў і сядзіба (1 двор, 10 жыхароў). У 1909 г. 39 двароў, 232 жыхара.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. З 1918 г. да 1964 г. ў Смаленскай вобласці РСФСР. Апрача школы ў 1924 г. працавалі бібліятэка, хата-чытальня, пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас, які з 1932 г. абслугоўвалася Хіславіцкая МТС. У Вялікаю Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28. 09 . 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На ўшанаванне памяці 48 землякоў, якія загінулі на фронце і ў партызанскай барацьбе, у 1969 г. ў вёске пастаўлены абеліск.

У 1976 г. далучана в. Шматаўка. У 1990 г. – 77 гаспадарак, 169 жыхароў, у складзе калгаса "Савецкая Расія" (цэнтр – в. Сапрынавічы). Працавалі 8-гадовая школа, клуб, бібліятэка, фельшарска-акушэрскі пункт, комплексна-прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, аддзялення сувязі, магазін.

У 2007 г. далучана да СВК “Кастрычнік”. Дзейнічае магазін, водаправод.

Зараз знаходзіцца ў калгасе ААТ “Кастрычнік”.

На 01.01.2023 г. насельніцтва складае 31 чалавек.

**БАГАЦЬКАЎКА** – вёска ў Падсолтаўскім сельсавеце, за 23 км ад Мсціслава.

У 1834 г. ў Мсціслаўскім павеце, 28 двароў, 116 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1880 г. 20 двароў, 161 жыхар. Апрача земляробства вяскоўцы займаліся шавецкім і кравецкім промысламі. Паводле перапісу 1897 г. ў Шамаўскай воласці Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерніі, в. Вялікая Багацькаўка (36 двароў, 210 жыхароў) пры дарозе Мсціслаў – Шамава. Побач была в. Малая Багацькаўка (20 двароў, 134 жыхары). У 1909 г. ў в. Вялікая Багацькаўка 30 двароў, 172 жыхары, школа граматы, у в. Малая Багацькаўка 21 двор, 160 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1926 г. было 42 вучня. У 1930 г. ў в. Вялікая Багацькаўка арганізаваны калгас “Рассвет”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 38 гаспадарак, меў 296 га ворыва, у. в. Малая Багацькаўка – калгас імя Чырвонай арміі, які аб’ядноўваў у 1932 г. 15 гаспадарак, меў 133 га ворыва. У калгасе “Рассвет” дзейнічала партыйная ячэйка; працавала кузня. Абслугоўваліся калгасы Курманаўскай МТС.

У Вялікаю Айчынную вайну з 14.07.1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1976 г. вёска Вялікая Багацькаўка і Малая Багацькаўка былі аб’яднаны ў адну з назвай Багацькаўка. У 1990 г. – 66 гаспадарак, 147 жыхароў, у складзе калгаса імя Леніна (цэнтр – в. Курманава). Працавалі пачатковая школа, магазін, музей пісьменніка М. Гарэцкага.

У 2007 г. ў СВК “Курманава”. Дзейнічае музей М. Гарэцкага – філіял рэспубліканскага Літаратурнага музея.

Радзіма беларускай песенніцы А. М. Гарэцкага (1864-1935), беларускага пісьменніка, празаіка, перакладчыка, фальклрыста, лексікографа М. І. Гарэцкага (1893-1938), вучоных у галіне геалогіі акадэмікаў АН БССР Г. І. Гарэцкага (1900-1988) і Р. Г. Гарэцкага (нар. ў 1928 г.).

Зараз ў складзе ААТ “Натапа-Агра”.

На 01.01.2023 насельніцтва складае 19 чал.

**БАРЫСАЎКА** – вёска ў Мушынскім сельсавеце, за 15 км ад Мсціслава.

У 1909 г. вёска, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета, 34 двары, 253 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. ўвайшла ў склад саўгаса “Перамога”. З 20.02.1938 г. ўвайшла ў склад Магілёўскай вобласці. У 1940 г. далучана вёска Данілаўка.

У Вялікую Айчынную вайну з 15.07.1941 г. да 03.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1990 г. 44 гаспадаркі, 109 жыхароў, у складзе саўгаса “Перамога” (цэнтр-в. Мушына). З 2007 г. ў СВК “Мушына”. Ёсць магазін.

Зараз ААТ “Мушына”.

На 01.01.2023 г. насельніцтва складае 58 чал.

**БЫКОВІЧЫ –** вёска ў Мазалаўскім сельсавеце, за 9 км ад Мсціслава. Праз вёску цячэ ручэй (прыток р. Чорная Натапа).

Па пісьмовых крыніцах вядомы з 16 ст. У 1589 г. сяло ў Мсціслаўскай воласці аднайменнага павета, дзяржаўная ўласнасць. У час руска-польскай вайны 1654-1667 гг. спустошана. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1834 г. ў Мсціслаўскім павеце, 13 двароў, 47 жыхароў, уласнасць памешчыка, які меў тут у 1879 г. 120 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1897 г. ў Старасельскай воласці быў аднайменны фальварак (1 двор, 6 жыхароў). У 1909 г. ў сяле 13 двароў, 96 жыхароў, у фальварку 1 двор, 4 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. У 1920 г. адкрыта школа, якая размяшчалася ў былым памешчыцкім будынку. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1925 г. ў школе навучаліся 42 вучні, дзейнічалі драматычныя і сельскагаспадарчыя гурткі. У 1931 г. арганізаваны калгас “Вольны шлях”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 22 гаспадаркі, меў 136 га ворыва, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС. У 1931 г. калгасу было перададзена ўрочышча Галыншчына. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці. У пачатку 1941 г. ў вёску пераселены жыхары в. Базылеўка.

У Вялікую Айчынную вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1990 г. 30 гаспадарак, 61 жыхар, у складзе калгаса “60 гадоў БССР” (цэнтр – в. Мазалава), працаваў магазін. У 2007 г. ў СВК “Мазалаўскі”.

Радзіма аднаго з арганізатараў партызанскага руху на тэрыторыі Столінскага раёна ў Вялікую Айчынную вайну В. Я. Ключанкова (1899 – жн. 1941).

На 01.01.2023 г.насельніцтва складае 5 чал.

**ВЯРКЕЕЎШЧЫНА** – вёска ў Мушынскім сельсавеце, за 19 км ад Мсціслава.

Па пісьмовых крыніцах вядома з пач. 20 ст. У 1909 г. вёска ў Казіміраваслабодскай воласці Мсціслаўскага павета, 8 двароў, 59 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. Ў складзе БССР. У 1926 г. 9 двароў, 65 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас, які абслугоўвала Ходасаўская МТС імя Тэльмана. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці.

У Вялікую Айчынную вайну з 15.07.1941 г. да 03.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1990 г. 14 гаспадарак, 37 жыхароў, у складзе саўгаса “Перамога” (цэнтр – в. Мушына). У 2007 г. ў СВК “Мушына”.

Зараз ў ААТ “Мушына”

На 01.01.2023 г насельніцтва складае 6 чал.

**ГІМБАТАЎКА** – вёска ў Капачоўскім сельсавеце, за 9 км ад Мсціслава.

Па мясцовых крыніцах вядома з 19 ст. Памешчык меў тут у 1854 г. 218 дзесяцін зямлі. У 1857 г. вёска ў Мсціслаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1875 г. адкрыта школа, для якой у тым жа годзе пабудавана амяшканне. У 1900 г. будынак згарэў, і школа размясцілася ў наёмным памяшканні. Паводле перапісу 1897 г. ў Аслянскай воласці Мсціслаўскага павета, 20 двароў, 72 жыхары. Непадалёку быў аднайменны фальварак, 1 двор, 8 жыхароў. У 1909 г. ў вёсцы 24 двары, 119 жыхароў, у фальварку 1 двор, 6 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўленна ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 33, а ў 1926 – 52 вучні. У 1926 г. 35 двароў, 210 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас “Вольная праца”, які ў 1931 г. аб’ядноўваў 59 гаспадарак, меў 388 га ворыва, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1990 г. 17 гаспадарак, 33 жыхары, у складзе саўгаса “Мсціслаўскі” (цэнтр – г. Мсціслаў). Працавалі магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва. У 2007 г. вёска далучана да СВК “Мазалаўскі”.

Радзіма члена-карэспандэнта АН БССР В. І. Семянкова (нар. 26.12.1925), беларускага гісторыка, кандыдата гістарычных навук А. Дз. Лебедзева (26.01.1936).

На 01.01.2023 насельніцтва складае 6 чал.

**ДАНІЛАЎСК** – вёска ў Падсолтаўскім сельсавеце, за 18 км ад Мсціслава.

У 1834 г. вёска ў Мсціслаўскім павеце, 7 двароў, 30 жыхароў, уласнасць памешчыка. Паводле перапісу 1897 г. ў Старасельскай воласці Мсціслаўскага павета, 33 двары, 225 жыхароў. Непадалёку была аднайменная сядзіба, 1 двор, 7 жыхароў. У 1909 г. ў вёсцы 38 двароў, 249 жыхароў, у сядзібе – 1 двор, 4 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас “Чырвоны партызан”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 48 гаспадарак, меў 276 га ворыва, абслугоўваўся Курманаўскай МТС, дзейнічала кузня. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На могілках у брацкай магіле пахаваны савецкія воіны, сярод якіх байцы 36-й стралковай дывізіі, што загінулі ў верасні 1943 г.

У 1990 г. 28 гаспадарак, 60 жыхароў, у складзе калгаса "Савецкая Беларусь" (цэнтр-в. Падсолтава). У 2007 г. ў СВК "Савецкая Беларусь".

На 01.01.2023 насельніцтва складае 0 чалавек.

**ДОБРАЕ**- вёска ў Мушынскім сельсавеце, за 22 км ад Мсціслава.

Першае пісьмовае ўпамінанне аб вёсцы адносіцца да 1499 г., калі тут быў гаспадарскі двор – уладанне князя Жаслаўскага. У 1560 г. сяло ў Мсціслаўскай воласці,дзяржаўная ўласнаць. У 1604 г. сяло ў Пуцькаўскім войтаўстве Магілёўскага староства, 30 валок зямлі, дзяржаўная ўласнасць. У час вайны Расіі з Рэчу Паспалітай 1654-67 гг. Спустошана ў выніку ваеных дзеянняў. У 1763 г. ў Мсціслаўскім ваяводстве ВКЛ, у складзе маёнтка Лапацін, уласнасць памешчыка.

Каля вёскі адбылося бітва рускіх і шведскі войскаў у час Паўночнай вайны 1700-21. На досвітку 30.08.1708 г. на р. Чорная Натапа частка рускай арміі на чале з генералам Галіцыным раптоўна атакавала шведскае войска. Тры шведскія палкі былі поўнасцю разбіты (3 тыс. салдат забіты і 3 тыс. паранены). Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1848 г. памешчык меў у вёсцы 130 дзесяцін зямлі і вадзяны млын. У 1880 г. 107 двароў, 68 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася сталярным, шавецкімі кравецкім промысламі. Дзейнічала царква, а ў 1895 г. адкрыта царкоўна – прыходская школа. Паводле перапісу 1897 г. сяло, 127 двароў, 825 жыхароў. У 1909 г. 120 двароў, 655 жыхароў, працавалі вінная крама і вадзяны млын.

Савецкая ўлада ўстаноўленна ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1926 г. было 112 вучняў. У 1926 г. 219 двароў, 1137 жыхароў. У красавіку 1930 г. арганізаваны калгас "12 гадоў Кастрычнікай рэвалюцыі", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 73 гаспадаркі, меў 619 га ворыва, абслугоўваўся Ходасаўскай МТС імя Тэльмана. Дзейнічалі кузня і ваўначоска. У 1935 г. адкрыты клуб З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай воласці.

У Вялікую Айчынную вайну з 15.07.1941 г. да 03.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1990 г. 53 гаспадаркі, 114 жыхароў, у складзе саўгаса "Перамога" (цэнтр – в. Мушына). Працавалі пачатковая школа, бібліятэка, клуб, магазін. У 2007 г. ў СВК "Мушына". Дзейнічае магазін.

Зараз АТТ "Мушына".

На 01.01.2023 насельніцтва складае 26 чал.

**ІРЦІШЧАВА** – вёска ў Падсолтаўскім сельсавеце, за 17 км ад Мсціслава.

У 1834 г. вёска ў Мсціслаўскім павеце, 4 двары, 27 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1880 г. 8 двароў, 59 жыхароў. Апрача земляробства вяскоўцы займаліся кушнерскім промыслам. Паводле перапісу 1897 г. ў Старасельскай воласці Мсціслаўскага павета, 11 двароў, 71 жыхар. У 1909 г. 13 двароў, 78 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас "Чырвоны араты", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 25 гаспадарак, меў 189 га ворыва, абслугоўваўся Курманаўскай МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці.

У Вялікую Айчыйнную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1976 г. далучана в. Антонаўка. У 1990 г. 30 гаспадарак, 66 жыхароў, у складзе саўгаса "Савецкая Беларусь" (цэнтр – в. Падсолтава). У 2007 г. вёска далучана да СВК "Савецкая Беларусь"

На 01.01.2023 насельніцтва складае 0 чалавек.

**КАЛІНАЎКА** – вёска ў Мазалаўскім сельсавеце, за 3 км ад Мсціслава.

У 1834 г. вёска ў Мсціслаўскім павеце, 5 двароў, 41 жыхар, уласнасць памешчыка. У 1858 г. 23 рэвізскія душы. Паводле перапісу 1897 г. ў Казіміраваслабодскай воласці Мсціслаўскага павета, 10 двароў, 65 жыхароў. У 1903 г. адкрыта земская школа, якая размяшчалася ў наёмным памяшканні. У 1909 г. 10 двароў, 79 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 25 вучняў. У пачатку 1930-х г. арганізаваны калгас. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці. У 1940 г. 42 двары, 198 жыхароў.

У Вялікую Айчынную вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія ў верасні 1943 г. поўнасцю спалілі вёску, загубілі 1 жыхара. Пасля вайны адбудавана.

У 1990 г. 14 гаспадарак, 30 жыхароў, у складзе саўгаса "Мсціслаўскі" (цэнтр – г. Мсціслаў). У 2007 г. вёска далучана да СВК "Мазалаўскі".

Зараз ААТ "Мазалаўскі".

На 01.01.2023 насельніцтва складае 8 чалавек.

**КАЎШОВА** – вёска ў Краснагорскім сельсавеце, за 10 км ад Мсціслава.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 17 ст. У 1654 г. вёска ў Мсціслаўскім ваяводстве ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. У 1745 г. вёска Каўшоў, уласнасць памешчыка. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1781 г. меўся маёнтак. У 1834 г. 94 жыхары, у 1847 ў складзе маёнтка Падлужжа Мсціслаўскага павета, 13 двароў, 80 жыхароў. Уласнасць памешчыка, які меў тут у 1857 г. 165 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1897 г.

ў Казіміраваслабодскай воласці Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерніі, 40 двароў, 307 жыхароў. Непадалёку быў аднайменны фальварак (1 двор, 5 жыхароў). У пачатку 20 ст. адкрыта школа (народнае вучылішча), у якой у 1907 г. навучаліся 37 хлопчыкаў, 3 дзяўчынкі. У 1909 г. ў вёсцы 38 двароў, 303 жыхары, у фальварку 1 двор, 4 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1920 г. адкрыта школа, якая размяшчалася ў былым памешчыцкім будынку. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. 9 сялянскіх сямей арганізаваны калгас "Чырвоны араты", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 19 гаспадарак, меў 118 га ворыва, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці. У 1940 г. 120 двароў.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія ў 1943 г. салілі 30 двароў. Пасля вайны адбудавана.

У 1990 г. 66 гаспадарак, 169 жыхароў, у складзе калгаса "ХХІ з'езд КПСС" (цэнтр – в. Падлужжа). Працавалі магазін, сярэдняя школа, дзіцячы сад, магазін.

Радзіма беларускага філосафа, доктара філасофскіх навук, прафесара А. І. Галаўнёва (1925-2008).

На 01.01.2023 насельніцтва складае 51 чалавек.

**КЛІН** – вёска ў Капачоўскім сельсавеце, за 14 км ад Мсціслава.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 17 ст. У 1684 г. вёска ў мсціслаўскім ваяводстве ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1834 г. вёска ў Мсціслаўскім павеце, 5 двароў, уласнасць памешчыка. Паводле перапісу 1897 г. ў Старасельскай воласці Мсціслаўскага павета, 15 двароў, 105 жыхароў. Непадалёку існавалі аднайменны фальварак (1 двор, 4 жыхары) і сядзіба (1 двор, 4 жыхары) дзейнічаў вадзяны млын. У 1909 г. ў. вёсцы было 16 двароў, 126 жыхароў, у фальварку – 1 двор, 3 жыхары, у сядзібе – 1 двор, 6 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. У 1921 г. створана меліярацыйнае таварыства. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1926 г. 27 двароў, 143 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас імя Парыжскай Камуны, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 13 гаспадарак, меў 87 га ворыва, абслугоўваўся Ходасоўскай МТС імя Тэльмана. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1990 г. 43 гаспадаркі, 84 жыхары, у складзе племсаўгаса "Пісараўшчына" (цэнтр – в. Капачы). У 2007 далучана да РУСП "Селекцыйна-гібрыдны цэнтр "Віхра". У вёсцы ёсць магазін.

На 01.01.2023 насельніцтва складае 14 чалавек.

**КРАСНАЕ** – вёска ў Ходасоўскім сельсавеце, за 27 км ад Мсціслава.

Па пісьмовых крыніцых вядомы з 1499 г. як гаспадаркі двор князя Жаслаўскага. У 16-17 ст. дзяржаўная ўласнасць. У 1523 г. сяло, дзейнічала царква. У 1573 г. 10 гаспадарак. У 1588 г. ў Мсціслаўскай воласці. У час руска-польскай вайны 1654-67 гг. спустошана. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1777 г. сяло Краснаполь у Чэрыкаўскай акрузе. У 1816 г. ў Чэрыкаўскім павеце, 6 двароў, 28 жыхароў, уласнасць памешчыка.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1926 г. 6 двароў, 35 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас "Новы шлях", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 36 гаспадарак з вёсак Краснае і Гарбатаўшчына, меў 329 га ворыва, абслугоўваўся Ходасоўскай МТС імя Тэльмана, дзейнічала кузня. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці.

У Вялікую Айчынную вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1990 г. 69 гаспадарак, 157 жыхароў, у складзе калгаса "XXVI з'езд КПСС" (цэнтр – в. Усполле). У 2007 г. вёска далучана да ААТ "Мсціслаўскі райаграпрамтэхзаб". Ёсць магазін.

На 01.01.2023 насельніцтва складае 31 чалавек.

**ЛАСТРЫГІНА** – вёска ў Краснагорскім сельсаве, за 27 км ад Мсціслава.

Заснавана ў 20-я г. на былых памешчыцкіх землях. Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас імя Чырвонага Кастрычніка, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 24 гаспадаркі, меў 119 га зямлі, з 1933 г. яго абслугоўвала Мсціслаўская МТС. З 20.02.1938 г. ў Мсціслаўскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну з 17.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1990 г. 14 гаспадарак, 32 жыхары, у складзе саўгаса імя Чапаева (цэнтр – в. Сялец). У 2007 г. ў СВК імя Чапаева.

Зараз ААТ "Сож-Агра".

На 01.01.2023 насельніцтва складае 1 чал.

**ЛЮДАГОШЧА** – вёска ў Краснагорскім сельсавеце, за 16 км ад Мсціслава.

Першае пісьмовае ўпамінанне аб вёсцы адносіцца да 1499 г., як гаспадарскі двор князя Жаслаўскага. У 1559 г. сяло ў Мсціслаўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У час вайны Расіі з Рэчы Паспалітай 1654-67 гг. спустошана ў выніку ваенных дзеянняў. У 1737 г. мелася царква. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1797 г. сяло Людагошча (40 двароў, 108 жыхароў) і аднайменны фальварак (9 жыхароў) належылі Маляціцкаму дамінікансаму кляштару, дзейнічала карчма. У 1848 г. ў складзе казённага маёнтка Галоўчыцы. Паводле перапісу 1897 г. ў Казіміраваслабодскай воласці Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерніі, 53

двары, 441 жыхар. У 1906 г. адкрыта земская школа. У 1909 г. 58 двароў, 536 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1926 г. было 42 вучні. У 1930 г. вяскоўцы арганізавалі калгас “Рада”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 56 гаспадарак, меў 308 га ворыва, працавалі кузня і ваўначоска. У 1931 г. пачала дзейнічаць прам. арцель “Чырвоны рыбак”. У 1933 г. калгас абслугоўвала Мсціслаўская МТС. Дзейнічалі кузня і ваўначоска. У 1953 г. адкрыты клуб. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці. У 1940 г. 120 двароў.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія спалілі 18 двароў. Пасля вайны адбудавана.

У 1990 г. 80 гаспадарак, 149 жыхароў, у складзе калгаса “XXVI з’езд КПСС”. У 2007 г. ў СВК “Сож-Агра” Дзейнічае магазін.

Зараз ААТ “Сож-Агра”.

На 01.01.2023 насельніцтва складае 23 чал.

**ЛЮТНЯ** (да 06.05.1978 г. Рагайлаўшчына) – вёска, цэнтр Капачоўскага сельсавета, за 3 км ад Мсціслава.

Праз 0,3 км знаходзіцца гарадзішча, што сведчыць аб засялені гэтых месц у далёкай старажытнасці. Па пісьмовых крыніцах вёска вядома з 19 ст. У 1834 г. сяло Рагайлаўшчына ў Мсціслаўскім павеце, 1 двор, 2 жыхары, уласнасць памешчыка. Паводле перапісу 1897 г. ў Старасельскай воласці Мсціслаўскага павета, 1 двор, 3 жыхары. У 1909 г. 7 жыхароў. У пачатку 20 ст. фальваркі Лютня (1двор, 7 жыхароў), Рагайлаўшчына (1 двор, 12 жыхароў) і Бобрыкі аб’ядналіся ў адну вёску, якая ўваходзіла ў Старасельскай воласці Мсціслаўскага павета.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. У 1919 г. адкрыта школа, якая размяшчалася ў былым памешчыцкім будынку (у 1925 г. вучняў). З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. Арганізаваны саўгасы “Рагалаўшчына” і “Бобрыкі”, якія спецыялізаваліся на вырошчванні гародніны і садавіны. У 1935 г. на іх базе створаны Мсціслаўскі конны завод № 120, адкрыты дзіцячыя яслі. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці. У 1940 г. 42 двары, 198 жыхароў.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1967 г. ў цэнтры вёскі на ўшанаванне памяці 328 землякоў, якія загінулі на фронце і ў партызанскай барацьбе, пастаўлены абеліск. З 21.04.1978 г. цэнтр сельсавета. У 1990 г. 177 гаспадарак, 160 жыхароў, цэнтр Мсціслаўскага коннага завода № 120, які спецыялізаваўся на вырошчванні запражных коней сярэдняй і цяжкавагай парод, на мясамалочнай жывёлагадоўлі, меў 6122 га сельгасугодзяў. У вёсцы працавалі дзіцячы сад-яслі, пачатковая школа, бібліятэка, клуб, сталовая, 2 магазіны, комплексны

прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, а таксама млын, конна-таварная ферма, з рабочым іпадромам. У 2007 г. цэнтр РУСП "Селекцыйна-гібрыдны цэнтр "Віхра", дзіцячы сад, сярэдняя школа, бібліятэка, клуб, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, аддзяленне сувязі. Месцамі адпачынку з'яўляюцца парк каля р. Суточка і жывапіснае наваколле ўздоўж рэк Суточка і Віхра.

На 01.01.2023 насельніцтва складае 312 чал.

**МАЙСКАЕ** (да 1941 г. Бізюкі) – вёска ў Мазалаўскім сельсавеце, за 14 км ад Мсціслава.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 1654 г. як сяло Бізюкі, уласнасць Мсціслаўскага кармеліцкага кляштара. Пасял 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1785 г. ў Мсціслаўскім павеце Магілёўскага намесніцтва, 4 двары, 29 жыхароў. У 1797 г. 26 жыхароў. У 1834 г. ў Чэрыкаўскім павеце, 14 жыхароў, уласнасць памешчыка. Паволе перапісу ў Казіміраваслабодскай воласці Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерніі, 14 двароў, 112 жыхароў. Непадалёку быў аднайменны фальварак (1 двор, 7 жыхароў). У 1909 г. ў сяле 18 двароў, 118 жыхароў, у фальварку 1 двор, 5 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас "Сталінскі замлік", які абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС. З 20.02.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1990 г. 15 гаспадарак, 34 жыхары, у складзе калгаса "60 гадоў БССР" (цэнтр – в. Мазалава"). У 2007 ў СВК "Мазалава".

Зараз ААТ "Мазалава".

На 01.01.2023 насельніцтва складае 3 чал.

**МІЛЕЙКАВА** – вёска ў Падсолтаўскім сельсавеце, за 22 км ад Мсціслава.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 16 ст. У 1579 г. сяло ў Мсціслаўскім ваяводстве ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У чэрвені 1881 г. сяляне захапілі памешчыцкую зямлю, правялі высечку лесу і аказалі супраціўленне ўладам пры размежаванні сваёй і памешчыцкай зямлі. Паводле перапісу 1897 г. ў Бохацкай воласці Мсціслаўскага павета, 48 двароў, 382 жыхары. У 1909 г. 61 двор, 380 жыхароў. У 1912 г. адкрыта земская школа.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1926 г. быў 41 вучань. У 1930 г. арганізаваны калгас "Чырвоны кастрычнік", які ў 1932 г. аб'ядноўваўся Курманаўскай МТС. У 1931 г. калгасу перададзены ўрочышчы Беразняк і Шырокае. З 20.02.1938 г. ў Магілеўскай вобласці.

У Вялікую Айчынную вайну ў ліпені 1941 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія ў кастрычніку 1941 г. закатавалі 7 жыхароў. Вызвалена 29.09.1943 г. часцямі 277-й стралковай дывізіі. У брацкай магіле пахаваны 4 савецкіх воіны, што загінулі ў баях супраць акупантаў 20.07.1941 г. На фронце і ў партызанскай барацьбе загінулі 74 вяскоўцы. У памяць аб іх у 1982 г. ў цэнтры вёскі пастаўлены абеліск.

У 1990 г. 97 гаспадаркі, 288 жыхароў, цэнтр калгаса "Ленінскі шлях", які спецыялізаваўся на мясамалочнай жывёлагадоўлі. Меў 3748 га сельгасугоддзяў, у тым ліку 2851 га ворыва, 56 трактароў, 15 збожжаўборочных камбайнаў, 49 грузавых аўтамашын і іншую тэхніку. У вёсцы працавалі пачатковая школа, дзіцячы сад-яслі, клуб, бібліятэка, Дом культуры, сталовая, гасцініца, гандлёвы цэнтр, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі. У 2007 г. цэнтр СВК "Мілейкава", дзіцячы сад, сярэдняя школа, бібліятэка, клуб, фельчарскі-акушэрскі пункт, магазін, аддзяленне сувязі.

Зараз ААТ "Натапа-Агра".

На 01.01.2023 насельніцтва складае 193 чал.

**МІХАЙЛАВА** – вёска ў Хадасоўскім сельсавеце, за 36 км ад Мсціслава.

Вядома з 1714 г. ў Крычаўскім старастве Мсціслаўскага ваяводства ВКЛ, дзяржаўная ўласнасць. У 1727 г. 37 дамоў. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. Паводле перапісу 1897 г. хутар Міхайлаў у Беліцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерніі, 15 двароў, 107 жыхароў. У 1909 г. 37 двароў, 179 жыхароў. У 1910 г. адкрыта царкоўная прыхадская школа.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас "Перамога" які ў 1932 г. аб'ядноўваў 52 гаспадаркі, меў 431 га ворыва і кузню. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці. У 1940 г. да вёскі далучаны хутар Калоша.

У Вялікую Айчынную вайну з 20.07.1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1990 г. 41 гаспадарка, 98 жыхароў, у складзе саўгаса "Забалацце" (цэнтр – в. Забалацце). Працавалі клуб, бібліятэка, магазін. У 2007 г. вёска ва УКСП "Забалацце".

Зараз ААТ "Натапа-Агра".

На 01.01.2023 насельніцтва складае 8 чал.

**МІЦЬКАЎШЧЫНА** – вёска ў Краснагорскім сельсавеце, за 12 км ад Мсціслава.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. У 1834 г. было 79 жыхароў. У 1847 ў складзе маёнтка Падлужжа, 13 двароў, 97 жыхароў, вадзяны млын, уласнасць памешчыка. Паводле перапісу 1897 г. ў Казіміраваслабодскай

воласці Мсціслаўскага павета, 31 двор, 263 жыхары. Побач на аднайменнай сядзібе 1 двор, 3 жыхары, вадзяны млын. У 1909 г. 43 двары, 323 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1926 г. ў вясковай школе было 59 вучняў. У красавіку 1931 г. арганізаваны калгас "Новае жыццё", які ў 1931 г. аб'ядноўваў 74 гаспадаркі, меў 516 ворыва, кузню. З 1914 г. на палях запрацавалі першыя трактары Мсціслаўскай МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці. У 1940 г. 57 двароў, 178 жыхароў.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія ў верасні 1943 г. спалілі вёску (49 двароў), загубілі 2 жыхароў. Пасля вайны адбудавана.

У 1976 г. далучана вёска Астрэйкавічы. У 1990 г. 50 гаспадарак, 102 жыхары, у складзе калгаса "XXI з'езд КПСС" (цэнтр – в. Падлужжа), працаваў магазін. У 2007 г. вёска ў СВК "Сож-Агра".

Зараз ААТ "Сож-Агра"

На 01.01.2023 насельніцтва складае 1 чал.

**ПАРАДЗІНА** – вёска ў Краснагорскім сельсавеце, за 8 км ад Мсціслава.

Першае пісьмовае ўпамінанне аб вёсцы адносіцца да 1499 г., як гаспадарскі дом Парадзіна, валоданне князя Жаслаўскага. У 1764 г. цэнтр дзяржавы ў Мсціслаўскім ваяводстве ВКЛ, казённая ўласнасць. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1848 г. вёска (53 двары) у складзе маёнтка Галоўчыцы Мсціслаўскага павета. У 1883 г. сяло ў Казіміраваслабодскай воласці Мсціслаўскага павета, 69 двароў, 513 жыхароў. Драўляная школа (з 1893). Паводле перапісу 1897 г. 108 двароў, 744 жыхары, хлебазапасны магазін, піцейны дом. У 1909 г. 116 двароў, 856 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. У 1921 г. працоўная школа 1-й ступені, якая дзейнічала ў вёсцы, быў перададзены былы памешчыцкі будынак. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1925 г. ў школе навучаліся 62 вучні, а ў 1926 – 86 вучняў, працавалі драматычны і харавы гурткі. У 1926 г. 180 двароў, 1111 жыхароў. У лютым 1929 г. арганізаваны калгас "1 Мая", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 167 гаспадарак, меў 659 га ворыва, кузню. Абслугоўвала яго Мсціслаўская МТС імя Кірава. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці. У 1940 г. 250 двароў.

У вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія спалілі вёску 50 двароў. Пасля вайны адбудавана.

У 1990 г. 150 гаспадарак, 355 жыхароў, у складзе калгаса "1 Мая" (цэнтр – в. Каробчына). Працавалі 8-гадовая школа, бібліятэка, клуб, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. У 2007 г. вёска ў СВК "Сож-Агра". Дзейнічае магазін, фельчарска-акушэрскі пунк.

Зараз ААТ "Сож-Агра".

На 01.01.2023 насельніцтва складае 59 чал.

**РАКШЫНО** – вёска, цэнтр Ракшынскага сельсавета, за 31 км ад Мсціслава.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 17 ст. У 1654 г. вёска пажалавана царом Аляксеем Міхайлавічам Івану Сямашку, нашчадку мітрапаліта Іосіфа Сямашкі. У 1667 г. сяло Ракошын аддадзена Мсціслаўскаму кармеліцкаму кляштару. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1777 г. сяло ў Чавускай акрузе Магілёўскай губерніі. Памешчык меў тут у 1876 г. 100 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1897 г. ў Расненскай воласці Чавускага павета Магілёўскай губерніі, 8 двароў, 46 жыхароў. Непадалёку былі 2 аднайменныя фальваркі: у адным – 1 двор, 10 жыхароў, у другім – 2 двары, 2 жыхары. У 1909 г. ў сяле 10 двароў, 57 жыхароў, у фальварках – 2 двары, 9 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1930 г. арганізаваны калгас "Пераможац", які абслугоўвала Курманаўская МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці.

У Вялікую Айчынную вайну з 11.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У брацкай магіле, што на могілках, пахаваны 27 воінаў 277-й стралковай дывізіі, якія загінулі ў баях у 1943 г.

У 1990 г. 68 гаспадарак, 146 жыхароў, цэнтр калгаса імя Свярдлова, які спецыялізаваўся на мясамалочнай жывёлагадоўлі. Меў 3897 га сельска-гаспадарчых угоддзяў. У вёскі працавалі сярэдняя школа, бібліятэка, сталовая, магазін, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, фельчарка-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, а таксама млын, конна-таварная ферма, з рабочым іпадромам. У 2007 г. вёска ў СВК "Сцяг працы" (цэнтр – в. Мішні). Дзейнічаюць Дом культуры, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі.

Зараз ААТ "Сцяг працы".

На 01.01.2023 насельніцтва складае 57 чал.

**РАССВЕТ** (да 1947 г. Чортава) – вёска ў Капачоўскім сельсавеце, за 13 км ад Мсціслава, на раке Свердзел.

У 1834 г. вёска Чортава ў Мсціслаўскім павеце, 5 двароў, 45 жыхароў, уласнасць памешчыка. Паводле перапісу 1897 г. вёскі Чортава (5 двароў, 39 жыхароў) і Чортава 1 (17 двароў, 122 жыхары) у Старасельскай воласці Мсціслаўскага павета.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў 1918 г. У 1919 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1926 г. было 58 вучняў, якая дзейнічала ў вёсцы, быў перададзены памешчыцкі будынак. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас "Шлях селяніна", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 45 гаспадарак, меў 177 га зямлі. Абслугоўвала яго Мсціслаўская МТС імя Кірава. Дзейнічала кузня. У 1931 г. калгасу было перададзена ўрочышча Папова Паляна. У 1930-х г. вёска Чортава і Чортава 1 былі аб'яднаны ў адну.

З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1930 г. арганізаваны калгас “Пераможац”, які абслугоўвала Курманаўская МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці.

У Вялікую Айчынную вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1976 г. далучана вёска Ржавец. У 1990 г. 112 гаспадарак, 310 жыхароў, у складзе Мсціслаўскага коннага завода № 120 (цэнтр – в. Лютня). У 2007 г. вёска ў РУСП “Селекцыйна-гібрыдны цэнтр “Віхра” (цэнтр – в Капачы), магазін.

Н 01.01.2023 насельніцтва складае 61 чал.

**РУБАНАЎКА** – вёска ў Падсолтаўскім сельсавеце, за 36 км ад Мсціслава, на раке Лядня.

У 1834 г. вёска Вялікая Рубанаўка (42 двары, 210 жыхароў) і Малая Рубанаўка (23 двары, 120 жыхароў) у Мсціслаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1858 г. ў вёскі Вялікая Рубанаўка 103 рэвізскія душы, у вёскі Малая Рубанаўка – 52, частка вяскоўцаў займалася калёсным промыслам. Паводле перапісу 1897 г. Шамаўскай воласці Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерніі, у Вялікай Рубанаўцы 47 двароў, 356 жыхароў, у Малой Рубанаўцы – 26 двароў, 195 жыхароў. Непадалёку была лясная вартоўня (1 двор, 9 жыхароў). У 1909 г. Вялікая Рубанаўцы 59 двароў, 432 жыхары, у Малой Рубанаўцы – 26 двароў, 210 жыхароў, ветраны млын. У 1910 г. адкрыта земская школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. На базе дарэвалюцыйнай адкрыта працоўная школа 1-й ступені, якой быў перададзены нацыяналізаваны будынак. У 1925 г. навучалася 65, а ў 1926 г. – 86 вучняў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1930 г. ў в. Вялікая Рубанаўка арганізаваны калгас “Бальшавік”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 57 гаспадарак, меў 505 га ворыва, у в. Малая Рубанаўка – калгас “Рассвет”, у якім у 1932 г. адпаведна 44 гаспадаркі і 292 га ворыва. Абслугоўвала калгасы Курманаўская МТС. Дзейнічала кузня. У 1931 г. калгасу “Рассвет” былі перададзены ўрочашчы Яўрэйскі Луг, Каршалішча, Кацубы. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці.

У Вялікую Айчынную вайну з 14.07.1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1976 г. Вялікая Рубанаўка і Малая Рубанаўка аб’яднаны ў адну вёску Рубанаўка. У 1990 г. 76 двароў, 180 жыхароў, у складзе “Камуніст” (цэнтр – в. Несцерава). Працавалі пачатковая школа, бібліятэка, клуб, магазін. У 2007 г. вёска ў СВК “Курманава”. Дзейнічае магазін.

Зараз ААТ “Натапа-Агра”.

На 01.01.2023 насельніцтва складае 30 чал.

**СЕЛІШЧЫ** – вёска ў Падсолтаўскім сельсавеце, за 29 км ад Мсціслава.

Першае пісьмовае ўпамінанне аб вёсцы адносіцца да 1499 г., як гаспадарскі дом, аддзены князю Жаслаўскаму. У 1638 г. сяло Селішча (яно ж Кацельнікі) у складзе маёнтка Беразятня Мсціслаўскага ваяводства ВКЛ, 9 гаспадарак, шляхецкая ўласнасць. У час вайны Рассіі з Рэччу Паспалітай 1654-67 гг. спустошана ў выніку ваенных дзеянняў. Паводле перапісу 1897 г. ў Шамаўскай воласці Мсціслаўскага павета 23 двары, 150 жыхароў. Побач быў фальварак, 1 двор, 6 жыхароў. У 1909 г. ў сяле 12 двароў, 64 жыхары, у фальварку – 7 двароў, 50 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. У 1921 г. працоўная школа 1-й ступені, якая дзейнічала ў вёсцы, быў перададзены былы памешчыцкі будынак. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1926 г. адкрыта школа, у якой было 34 вучні. У 1931 г. 18 гаспадарак аб'ядналіся ў калгас "Заранак новага жыцця", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 20 гаспадарак, меў 110 га ворыва, кузню. Абслугоўвала яго Курманаўская МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці.

У Вялікую Айчынную вайну з 14.07.1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На могілках у брацкай магіле пахаваны 5 воінаў 344-й стралковай дывізіі, якія загінулі ў баях у 1943 г.

У 1990 г. 4 гаспадаркі, 10 жыхароў, у складзе калгаса "Камуніст" (цэнтр – в. Несцерава). У 2007 г. вёска ў СВК "Курманава".

Зараз ААТ "Натапа-Агра".

На 01.01.2023 насельніцтва складае 0 чал.

**СТАРЫНА** – вёска ў Падсолтаўскім сельсавеце, за 32 км ад Мсціслава.

У 1834 г. вёска ў Мсціслаўскім павеце, 39 двароў, 234 жыхары, уласнасць памешчыка. У 1880 г. ў Шамаўскай воласці Мсціслаўскага павета, 289 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім і бандарным промысламі. Паводле перапісу 1897 г. 55 двароў, 346 жыхароў, 2 ветраныя млыны. У 1909 г. 51 двор, 327 жыхароў, школа граматы. 23.09.1910 г. жыхары аказалі супраціўленне землемеру і паліцыі пры размежаванні зямель вяскоўцаў і памешчыка.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас імя Сталіна які абслугоўвала Курманаўская МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці.

У Вялікую Айчынную вайну з 14.07.1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У 1990 г. 55 двароў, 85 жыхароў, у складзе калгаса імя Леніна (цэнтр – в. Курманава). Працавалі пачатковая школа, магазін. У 2007 г. вёска ў СВК "Курманава".

Зараз ААТ "Натапа-Агра".

На 01.01.2023 насельніцтва складае 6 чал.

**СУТОКІ** – вёска ў Мазалаўскім сельсавеце за 3 км ад Мсціслава.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 17 ст. У 1654 г. вёска ў Мсціслаўскім ваяводстве ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. У 1654 г. падарана Мсціслаўскаму карметіцкаму кляштару. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1785 г. сёлы Вялікія Сутокі (8 двароў, 49 жыхароў, млын) і Малыя Сутокі (2 двары, 37 жыхароў) у Мсціслаўскім павеце Магілёўскага намесніцтва, уласнасць памешчыка. Адзін памешчык меў тут у 1848 г. 153 дзесяцін зямлі і вадзяны млын, у 1872 г. 229 дзесяцін зямлі, другі меў у 1878 г. 440 дзесяцін зямлі і млын. Паводле перапісу 1897 г. фальваракі Вялікія Сутокі (1 двор, 11 жыхароў), Малыя Сутокі (1 двор, 2 жыхары) і Сутокі (1 двор, 28 жыхароў), сядзіба Сутокі (1 двор, 9 жыхароў).

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1925 г. створана сельска-гаспадарчы артэль "Чырвоны сцяг", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 24 гаспадаркі, меў 80 га ворыва, абслугоўвала Мсціслаўская МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці. У 1940 г. 19 двароў, 109 жыхароў.

У Вялікую Айчынную вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захонікамі, якія ў верасні 1943 г. спалілі 18 двароў, загубілі 10 жыхароў. Пасля вайны адбудавана.

У 1990 г. 17 гападарак, 41 жыхар, у складзе саўгаса "Мсціслаўскі" (цэнтр – г. Мсціслаў). У 2007 г. вёска ў СВК "Мазалаўскі".

Зараз ААТ "Мазалаўскі".

На 01.01.2023 насельніцтва складае 15 чал.

**УСПОЛЛЕ** – вёска ў Хадасоўскім сельсавеце, за 23 км ад Мсціслава, на раке Чорная Натапа.

Першае пісьмовае ўпамінанне аб вёсцы адносіцца да 1579 г., ў складзе Радамскага староства ВКЛ. У Літоўскай метрыцы ёсць звесткі аб ёй пад 1596 і 1635гг. З 1659 г. належыла памешчыку, які непадалёку меў мёнтак. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1777 г. вёска Ушполы ў Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерніі. У 1816 г. ў Чэрыкаўскім павеце, 18 двароў, 78 жыхароў, уласнасць памешчыка. Памешчык меў тут у 1868 г. 560 дзесяцін зямлі і вадзяны млын. У 1889 г. адкрыта земская школа. Паводле перапісу 1897 г. ў Доўгавіцкай воласці Чэрыкаўскага павета, 24 двары, 145 жыхароў. У аднайменнай аколіцы, што знаходзіліся непадалёку, было 23 двары, 148 жыхароў. У 1905 г. ў школе навучалася 50 хлопчыкаў і 10 дзяўчынак. У 1909 г. ў вёсцы 60 двароў. 226 жыхароў, у аколіцы – 20 двароў, 205 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. На базе дарэвалюцыйнай адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. навучалася 82 вучні. 25.10.1929 г. арганізаваны калгас "Чырвоны Кастрычнік", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 72 гаспадаркі, меў 792 га ворыва. У 1936 адкрыты клуб.

Абслугоўвала яго Ходасаўская МТС імя Тэльмана. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобласці.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія спалілі вёску. Пасля вайны адбудаваны. Каля Дома культуры ў памяць аб 73 земляках, што загінулі на фронце і ў партызанскай барацьбе, у 1967 г. пастаўлена стэла.

У 1990 г. 144 гаспадаркі, 392 жыхары, цэнтр калгаса "XXVI з'езд КПСС", які спецыялізаваўся на мясамалочнай жывёлагадоўлі і вырошчванні лёну. Меў 3373 га сельскагаспадарчых угоддзяў. У вёсцы працавалі дзіцячы сад, 8-гадовая школа, бібліятэка, Дом культуры, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, сталовая, магазін, фельчаска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, музей працоўнай славы. У 2007 г. вёска ў складзе ААТ Мсціслаўскі райаграпрамтэхзаб".

На 01.01.2023 насельніцтва складае 185 чал.

**Каляндар знамянальных і памятных дат на 2024 год**
**Мсціслаўскі раён**

Бібліяграфічны паказальнік

складальнік Хмуровіч Святлана Віктараўна

адказны за выпуск Н. В. Сідарэнкава

Дзяржаўная ўстанова культуры
“Сетка публічных бібліятэк Мсціслаўскага раёна”,

213453 г. Мсціслаў вул. Пралятарская, 36
Тэлефон (02240)44870
Эл. Пошта: Mstislavl_bib@mail.ru